КОНКУРСНЫЯ ПРАГРАМЫ «ЛІСТАПАДА» 8

НАТАТКІ ПАЛОМНІКА Ў ІЕРУСАЛІМ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. СУБОТА № 195 (29062)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**100,5 %**

*склаў індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў верасні 2019 года ў параўнанні са жніўнем 2019-га; са снежнем 2018-га — 103,4 %, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. Харчовыя тавары ў верасні падаражэлі на 0,1 % у параўнанні са жніўнем 2019-га і на 2,2 % у параўнанні са снежнем 2018-га. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 0,9 % у параўнанні са жніўнем 2019-га і на 3,2 % — у параўнанні са снежнем 2018 года. Паслугі ў верасні ў параўнанні са жніўнем гэтага года падаражэлі на 0,6 %, у параўнанні са снежнем 2018 года — на 5,8 %.*



# БЯСПЕКА: УНУТРАНАЯ, ЗНЕШНЯЯ І ЭКАНАМІЧНАЯ

Аляксандр Лукашэнка заклікаў краіны СНД падтрымаць ініцыятыву фарміравання пояса лічбавага добрасуседства



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі ў чацвер прыбыў у сталіцу Туркменістана, Ашгабат, для ўдзелу ў саміце Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Учора падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў краін СНД беларускі лідар прадставіў бачанне нашай дзяржавы па значных пытаннях дзейнасці арганізацыі — эканамічным узаемадзеянні, узмацненні Садружнасці, бяспецы, замарожаных канфліктаў на постсавецкай прасторы.**

Пагрозы бяспецы дамінуюць у спісе сучасных выклікаў чалавецтву, у тым ліку з-за страты даверу паміж краінамі. Таму сёння, на думку Аляксандра Лукашэнкі, неабходна шукаць аб'яднальны парадак, новыя ідэі, якія падзяляюць многія краіны і арганізацыі. Найбольш востраў ён назваў праблему тэрарызму, ні адна дзяржава свету не можа справіцца з ёю самастойна. «Ключ да поспеху ляжыць у цеснай каардынацыі дзеянняў на ўсіх узроўнях. Таму наша праграма супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у барацьбе з тэрарызмам і іншымі гвалтоўнымі праявамі экстрэмізму сёння з'яўляецца як нельга больш запатрабаванай і актуальнай, — передае словы Прэзідэнта БелТА. — Апошнім часам сфарміраваліся новыя тэрарыстычныя рызыкі і пагрозы. Найбольшую небяспеку ўяўляюць кіберзлачыннасць і кібертэрарызм».

СТАР. 2

# Парасоны для матулі



У гарадскім пасёлку Бешанковічы шмат сем'яў, якія выхоўваюць па тры і болей дзяцей. Да такіх адносіцца і сям'я святара праваслаўнага храма Мікалая і Вольгі КІСЯЛЁЎ. Маладая сям'я гадуе дачушку і двух сыночкаў. Летась Вольга Аляксандраўна была адзначана дыпломам у гонар легендарнай матулі Зінаіды Тусналобавай-Марчанка за сваю грамадскую работу і духоўна-маральнае выхаванне дарослых і дзяцей райцэнтра. Матушка Вольга кіруе дзіцячымі гурткамі творчага майстэрства ў нядзельнай школе, працуе ў тэрытарыяльным Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёна, пры храме ўзначальвае клуб «Вера, Надзея і Любоў». На гэтым здымку Вольга Аляксандраўна са сваімі сынамі Мікітам і Мацвеем і шасцігадовай дачушкай Надзеяй падчас прагулкі па восеньскім гарадскім парку.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- Заўтра прафесійнае свята адзначаюць работнікі культуры Беларусі. З гэтай нагоды іх павіншаваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.
- **У Беларусі павысіўся сярэдні ўзрост жанчын пры нараджэнні першага дзіцяці — з 24,9 да 26,7 года.**
- У перапісе насельніцтва, па звестках на 9.00 11 кастрычніка, прынялі ўдзел 2 млн 295,1 тыс. беларусаў.
- **У Маскве на 86-м годзе жыцця памёр двойчы Герой Савецкага Саюза касманаўт Аляксей Лявонаў, першы ў гісторыі чалавек, які здзейсніў выхад у адкрыты космас.**



Аты-баты

# «Тата вернецца, калі ападуць усе лісцікі»

## Чаму сямейная падтрымка неацэнная для салдата

**Трывалая сувязь з блізкімі і роднымі вельмі важная для чалавека, які служыць у войску. Дзякуючы ёй ён не будзе адчуваць сябе адарваным ад дома, клопатаў сваёй сям'і. І «мяч» у гэтай нялёгкай справе ў першую чаргу на баку сваякоў.**

Аляксандр Пракопчык служыць у 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе. Дома яго чакаюць маці, жонка Хрысціна і пяцігадовы сын Ваня. Яны збіраюцца разам за сталом, калі толькі выпадае такая магчымасць. Пакуль жа дадому Аляксандр наведваецца, як толькі ёсць магчымасць. Іншая рэч, што ў разведвальным батальёне, дзе ён служыць, з-за частых практычных заняткаў на палігонах звальненні не заўжды здараюцца рэгулярна. І таму становіцца яшчэ больш каштоўныя і цёплыя ў сямейным атачэнні. Падчас аднаго такога звальнення завіталі дадому да сям'і салдата і карэспандэнты «Звязды».

СТАР. 4



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

19195

# БЯСПЕКА: УНУТРАНАЯ, ЗНЕШНЯЯ І ЭКАНАМІЧНАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У верасні ў Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя высокага ўзроўню па барацьбе з тэрарызмам з выкарыстаннем новых і ўзнікаючых тэхналогій. Падчас яе Беларусь выступіла з ініцыятывай аб «поясе лічбавага добрасуседства».

«У якасці механізма яе рэалізацыі мы бачым заключэнне пагадненняў аб забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі. Іх ключавымі элементамі маглі б стаць ідэі лічбавага суверэнітэту і нейтралітэту, што будзе гарантаваць неўмяшанне краін у інфармацыйныя рэсурсы адна аднаго», — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама адзначыў, што неабходна ўзмацняць Садружнасць як самадастатковае і эфектыўнае аб'яднанне, фундаментам якога з'яўляецца эканоміка. Прэзідэнт у гэтым кірунку падкрэсліў актуальнасць падрыхтаванай да саміту Дэкларацыі аб стратэгічным эканамічным супрацоўніцтве, якая яшчэ раз пацвердзіць імкненне да кансалідацыі эканамічных патэнцыялаў краін, паглыблення вытворча-кааперацыйных і гандлёвых сувязяў.

Краіны Садружнасці фактычна выйшлі на завяршальную стадыю падрыхтоўкі Стратэгіі эканамічнага развіцця СНД на перыяд да 2030 года. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў дапоўніць яе канкрэтнымі прарыўнымі праектамі, якія могуць стаць агульнымі пунктамі эканамічнага росту. Паводле яго слоў, найважнейшай задачай эканамічнага парадку дня застаецца фарміраванне паўнавартаснай зоны свабоднага гандлю.

Замарожаныя канфлікты постсавецкай прасторы таксама патрабуюць вырашэння. «Разам былі, разам ваявалі, а паглядзіце, што робіцца на постсавецкай прасторы. Колькі такіх канфліктаў... Чаму мы не вырашаем гэтыя пытанні? Калі мы на нешта здольныя, трэба вырашаць гэтыя праблемы, — сказаў беларускі лідар. — Не варта ствараць сітуацыю, калі на дапамогу трэба заклікаць людзей з-за акіяна!»

Актуальная ў гэтым ракурсе тэматыка канфлікту ва Украіне. Прэзідэнт Беларусі заклікаў падтрымаць дзеючую там уладу. У выпадку звяржэння існуючага парадку немагчыма прадказаць, у якой трагічнай сітуацыі апынецца краіна. «Што было б дрэннага, калі б цяперашні Прэзідэнт Украіны, а ён разумны, нармальны чалавек, сёння прысутнічаў у нас? У яго б не было праблемы пагаварыць з адным прэзідэнтам, з другім, трэцім, сустрэцца тут з Прэзідэнтам Расіі, пра сустрэчу з якім ён шмат цяпер кажа. Таму не трэба рабіць няправільных крокаў, асабліва цяпер. Не трэба спяшацца», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што беларускім бокам была вылучана ініцыятыва аб неразмяшчэнні ракет сярэдняй і меншай далёкасці ў Еўропе. «Пасля спынення дзеяння адпаведнага дагавора становіцца вельмі верагодным з'яўленне такіх узбраенняў у еўрапейскай частцы кантынента. А гэта непазбежна цягне за сабой пагрозу новага вітка ваеннай канфрантацыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы і падкрэсліў, што Беларусь як паўнапраўная ўдзельніца дагавора не выходзіла з яго і не мае намер гэта рабіць, калі не будзе пагроз яе бяспецы.

Пракаментаваў Прэзідэнт і маштабныя вучэнні каля беларускай мяжы: «НАТА чамусьці вырашыла праз літаральна некалькі месяцаў правесці каля нашых межаў буйнамаштабныя вучэнні і задзейнічаць столькі тысяч, колькі ніколі не задзейнічала. Гэта Польшча і краіны Балтыі. Гэта ненармальна. Гэта не кажа пра тое, што мір прыйшоў на тэрыторыю Еўропы і ачагоў такіх не ўзнікне ў будучыні. Гэта незразумелыя вучэнні. Напэўна, нам з Прэзідэнтам Расіі прыйдзецца падумаць аб тым, як засцерагчы сябе ў гэты перыяд. Таму што там будзе ўдзельнікаў каля 30 тысяч», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі ў сваёй прамове згадаў і падрыхтаваны для прыняцця на саміце Зварот у сувязі з 75-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

«Сёлета мы адсвяткавалі 75-годдзе вызвалення Беларусі. Наш народ заплаціў высокую цану за сваю свабоду — у барацьбе з фашызмам загінуў кожны трэці беларус. Нашчадкі той страшэннай вайны мы адчуваем па гэты дзень», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Перамогу ў гэтай вайне падарыў нам вялікі савецкі народ! Паміраючы ў асаджанай Брэсцкай крэпасці і блакадным Ленінградзе, змагаючыся пад Сталінградам і Курскам, вызваляючы Еўропу і штурмуючы Берлін, рускія, беларусы, украінцы, казахі, армяне, азербайджанцы, малдаване, грузіны, кіргізы, таджыкі, туркмены і ўзбекі, іншыя народы не думалі пра сваю нацыянальную прыналежнасць. Яны былі адзіныя, узнімаючы Сцяг Перамогі над Рэйхстагам. Значыць, і наша Перамога павінна быць адзіная і непадзельная!» — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што, падпісваючы зварот, бакі зноў дэманструюць сваю з'яднанасць і дружбу, беражлівае стаўленне да агульнай вялікай гісторыі. «Адзіным фронтам супрацьстаім спробам яе скажэння і фальсіфікацыі. Разам выступаем за аднаўленне шырокага міжнароднага дыялогу па ўмацаванні сістэмы глабальнай бяспекі і мер даверу», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

* * *

Учора Аляксандр Лукашэнка таксама правёў двухбаковыя перагаворы з Прэзідэнтам Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым.

«У нас сапраўды ёсць вельмі добрыя планы, якія мы з вамі абавязкова рэалізуем. Мы стварылі фундамент нашых адносін, вельмі шмат зрабілі,— заявіў кіраўнік Беларусі. — Я вас падтрымліваю ў тым, што ў нас наперадзе яшчэ вельмі шмат спраў, якія мы абавязкова павінны здзейсніць».

Выбары-2019

# Восем чалавек на месца

## Самаму сталаму прэтэндэнту на кандыдацтва — 83 гады

**Старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА падчас відэабрыфінгу, які зладзіў Нацыянальны прэс-цэнтр, расказала аб ходзе выбарчай кампаніі. Кіраўнік Цэнтрвыбаркама паведаміла, што камісія зарэгістравала 56 кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі. Дакументы на рэгістрацыю ў кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў падалі 703 чалавекі. Яшчэ 34 камплекты дакументаў для ўдзелу ў выбарах у ніжнюю палату падаў Рух «За свабоду», аднак па законе грамадскія аб'яднанні не маюць права вылучэння кандыдатаў.**

Самы вялікі конкурс — у Мінску, больш за восем прэтэндэнтаў на кандыдацтва ў выбарчай акрузе. Аднак Лідзія Ярмошына прагназуе, што не ўсе з іх будуць зарэгістраваныя пасля праверкі дакументаў акруговымі выбарчымі камісіямі. Дарэчы, пасля рэгістрацыі, якая завяршыцца 17 кастрычніка, роўна за месяц да выбараў, звесткі аб кандыдатах з'явяцца ў мабільнай праграме «Галасую!».

Эксперымент па выкарыстанні гэтай праграмы, распрацаванай БРСМ бясплатна, прайшоў летась у Мінску падчас выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Сёлета распрацоўка распаўсюджана на ўсю краіну. Цэнтрвыбаркам запрашае грамадзян паведамляць аб недакладнасцях у праграме. Лідзія Ярмошына падкрэсліла таксама, што далёка не ўсе дзяржавы накіроўваюць выбаршчыкам неабходную інфармацыю і друкаваныя запрашэнні.

«Сёлетняя выбарчая кампанія ў парламент — вельмі актыўная. Колькасць прэтэндэнтаў (яшчэ да рэгістрацыі) большая, чым тры гады таму, і значна большая, чым у 2008 і 2004 гадах. Па сутнасці, мы вярнуліся да лічбаў 2000 года, калі былі вельмі яскравыя, вельмі альтэрнатыўныя парламенцкія выбары. Таму казаць, што «ў нас няма дэмакратыі», — недарэчна», — лічыць старшыня ЦВК.

Парламенцкія выбары — 2019, па словах Лідзіі Ярмошынай, не толькі альтэрнатыўныя, але эканамічныя і сацыяльныя. Кожны кандыдат можа ўдзельнічаць у выбарах бясплатна, яму даецца эфірны час і друкаваныя плошчы.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама паведаміла, што ў Беларусі сфарміравана амаль шэсць тысяч участковых камісій, 46 з іх утвораны за межамі краіны. Сярод членаў участковых камісій больш за ўсё прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў: прафсаюзаў, «Белай Русі», Саюза жанчын. Колькасць палітычных партый — удзельніц у выбарах у параўнанні з папярэдняй кампаніяй узрасла да дванаццаці.

Для назірання за ходам выбараў ужо акрэдытавана больш за 200 прадстаўнікоў Выканкама СНД і дванаццаць — ад АБСЕ. На наступным тыдні ў Беларусь прыедзе кіраўнік місіі назіральнікаў і група доўгатэрміновых назіральнікаў ад БДІПЧ АБСЕ.

На парламенцкіх выбарах адсутнічае максімальная ўзроставая мяжа — выбірацца можна з 21 года і пакуль ёсць сілы. Сёлета пазмагацца за дэпутацкі мандат збіраецца грамадзянін, які дасягнуў узросту 83 гадоў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# Кадры трэба замацоўваць

**У Брагіне правёў прамую лінію і прыём грамадзян памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА.**



Фота БелТА.

Першая патэлефанавала гамяльчанка, маладая маці Юлія Несцярэнка. Яна агучыла праблему, якая хвалюе ўсіх жыхароў мікрараёна Хутар. Размова ішла пра інфраструктуру, якой у гэтым новым мікрараёне практычна няма. Пытанне вядомае ўладам Гомельшчыны даўно. Юрый Вітольдавіч паабяцаў, што налета школа пачне праектавацца, але напярэдадні адбудзецца сустрэча з зацікаўленымі жыхарамі мікрараёна, каб падрабязна высветліць не толькі гэтую, але і іншыя іх праблемы.

Дэпутат Камарынскага сельсавета Ірына Пятніцкая прасіла дапамагчы да ладу добраўпарадкаванне шматкватэрнага дома і двара ў гэтым гарадскім пасёлку. Памочнік Прэзідэнта адразу ж даў даручэнне службам ЖКГ Брагінскага раёна з панядзелка пачаць і як мага хутчэй завяршыць ліквідацыю ўсіх недаробак, пра якія казала жанчына.

Былы жыхар Брагіншчыны Аляксандр Цярэшчанка прасіў працягнуць добраўпарадкаванне на яго малой радзіме — у вёсцы Рудня Жураўлёва. Цяпер там раённымі ўладамі створана памятнае месца, прысвечанае жыхарам, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Грамадзянін лічыць, што будзе карыстацца папулярнасцю і міфалагічная сцяжына, для стварэння якой тут ёсць усе магчымасці. Пытанне гэта будзе вывучана мясцовымі ўладамі.

Людзі задавалі падчас прамой лініі самыя разнастайныя пытанні, якія датычыліся прыватных праблем: прыватызацыі, устанаўлення граніц зямельных участкаў, атрымання пенсіі... Многія пытанні патрабуюць дадатковага вывучэння і кансультацый з адпаведнымі спецыялістамі, якія будуць праведзены, каб даць усім адказы ў вызначаны тэрмін.

Юрый Шулейка задаў пытанні наконт падрыхтоўкі Брагінскага раёна да ацяпляльнага сезона. Між тым наступны званок ад жыхаркі Камарына засведчыў, што не ўсё так добра, як казалі мясцовыя чыноўнікі. Тамара Салаў'ёва папрасіла разабрацца з рамонтам дарог у Камарыне.

Жыхар райцэнтра Юрый Сапоненка паведаміў пра сваю жыллёвую праблему. Яго дом знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, аднак стан жылля пакідае жадаць лепшага. Знос будынка — 100 %. Дом афіцыйна непрыдатны для пражывання па санітарных нормах, ёсць вялікія пытанні па ацяпленні. Была агучана прапанова па рамонце, з якой заяўнік пагадзіўся.

Размова зайшла і пра пытанні замацавальнасці кадраў у гэтым «чарнобыльскім раёне». 80 % маладых спецыялістаў застаюцца працаваць на першым рабочым месцы. Сёлета на Брагіншчыну з розных медыцынскіх устаноў прыехала вялікая група ўрачоў розных спецыяльнасцяў. Між тым тэма падтрымкі, стымулявання маладых спецыялістаў, якія прыйшлі на работу на тэрыторыю, пацярпелую ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, застаецца актуальнай, адзначыў Юрый Шулейка:

— Некаторыя аспекты вырашальныя, частка ўжо вырашана на ўзроўні ўрада: з'явіліся дакументы, якія стымулююць замацаванне маладых спецыялістаў. Мы будзем яшчэ раз вяртацца да гэтай тэматыкі. Пытанне неабходна прапрацоўваць і надалей.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# На дзяржаўным узроўні

**Кіраўніцтва і службовыя асобы Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі з 14 да 18 кастрычніка правядуць выязныя асабістыя прыёмы грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.**

Адначасова прадстаўнікі Адміністрацыі вывучаць сітуацыю на месцах — выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы, эфектыўнасць дзеяння мясцовых органаў улады па павышэнні ўзроўню жыццезабеспячэння насельніцтва. Асаблівую ўвагу плануецца ўдзяліць пытанням сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, выяўленню праблем, якія выклікаюць занепакоенасць людзей і патрабуюць аператыўнага вырашэння.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці **Ігар ЯЎСЕЕЎ 15 кастрычніка ў 10.00** сустрэнецца з жыхарамі ў **Вілейскім райвыканкаме.** Намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення ідэалогіі і інфармацыйнай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта **Уладзімір МАТУСЕВІЧ 15 кастрычніка ў 11.00** пачне прыём грамадзян у **Мазырскім райвыканкаме.**

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінску **Віталь ПРЫМА** правядзе прыём **16 кастрычніка з 9.00 у адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска.** Начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта **Юрый КРЫВАШЭЕЎ** сустрэнецца з жыхарамі **16 кастрычніка ў 10.00 у Дзяржынскім райвыканкаме.**

Начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта **Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** будзе працаваць на прыёме **17 кастрычніка з 10.00 у Барысаўскім райвыканкаме.**

Прыём памочніка Прэзідэнта — інспектара па Брэсцкай вобласці **Анатоля МАРКЕВІЧА** адбудзецца **18 кастрычніка ў 10.00 у Баранавіцкім райвыканкаме.** Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі — начальнік упраўлення кіруючых кадраў і дзяржаўных узнагарод Адміністрацыі Прэзідэнта **Генадзь РАШАЦЬКО** будзе працаваць са зваротамі **18 кастрычніка ў 11.00 у Шаркаўшчынскім райвыканкаме.**

Запісацца на прыёмы можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# АД ФОРУМУ РЭГІЁНАЎ ДА ЮБІЛЕЮ МАНАСТЫРА

## Уладзімір КРАЎЦОЎ расказаў аб значных падзеях 2020 года, што адбудуцца на Гродзеншчыне

**Пытанні, з якімі прадстаўнікі СМІ падчас выязной прэс-канферэнцыі ў Мастах звярнуліся да старшыні аблвыканкама, сёння на слыху і хваляюць многіх жыхароў. Гэта і пуск першай беларускай АЭС, і праблема пластыкавай упакоўкі, і добраўпарадкаванне мясцовых дарог, і сітуацыя з мабільнікамі ў школах... Уладзімір Краўцоў падрабязна расказаў пра тое, як вырашаецца спрэчнае пытанне па стыхійных дачах, і паведаміў, дзе пройдзе III Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны.**

Пра тое, што Гродна налета прыме наступны Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны, стала вядома літаральна днямі, адзначыў Уладзімір Краўцоў. Ён назваў гэта рашэнне сур'ёзнай падзеяй для гродзенцаў. III Форум адбудзецца ў лістападзе. Ужо цяпер Гродзеншчына пачынае падрыхтоўку, каб правесці яго на высокім узроўні.

Між тым гэта падзея не пакінула ўбаку злабадзённых пытанні рэгіёна. Адным з самых актуальных застаецца пуск першага энергаблока атамнай станцыі ў Астраўцы. Журналісты даведаліся, што ў сувязі з гэтым пашырыцца выкарыстанне электраэнергіі ў прамысловасці, на транспарце, у побыце. У Гродне ўжо зарэгістравана 10 электрамабіляў, і іх колькасць будзе расці. Таксама пачнецца будаўніцтва цалкам электрыфікаваных жылых дамоў. Для тых, хто распачне новую справу, будуць дзейнічаць ільготныя тарыфы. А вось для жыхароў Астравецкага раёна такіх ільгот не прадугледжана. Затое горад атамшчыкаў атрымаў шмат значных аб'ектаў. Тут пабудавалі 63 шматпавярховікі, чатыры дзіцячыя садкі, дзве сярэднія школы, аб'екты культуры. Больш чым удвая павялічылася колькасць насельніцтва. Будзе ўведзены спартыўны комплекс, цэнтральная раённая бальніца, лядовая пляцоўка і іншыя аб'екты.

Балючая для многіх жыхароў тэма — мясцовыя дарогі. Улады павінны забяспечыць доступ нават да самых аддаленых хутароў, адзначыў Уладзімір Краўцоў. А ўсяго трэба адрамантаваць 800 кіламетраў мясцовых дарог. Сёлета будзе зладзена больш за 200, амаль 230 кіламетраў — налета. Аднаўленне закране ўсе раёны вобласці. Фінансаванне вядзецца з трох крыніц — транспартны падатак, бюджэт і крэдыт Банка развіцця. Але не толькі яны дапамагаюць: добрай падмогай сталі трансгранічныя праекты. За сродкі міжнароднай праграмы будзе адрамантавана 20 кіламетраў дарожнага пакрыцця ў Гродзенскім раёне.

Прагучалі пытанні па пераходзе ад пластыкавай тары да больш экалагічных матэрыялаў. Сапраўды, тэма цяпер актуальная і патрабуе адпаведных мер. І яны прымаюцца. Як адзначыў кіраўнік рэгіёна, у рэспубліцы праходзіць узгадненне праекта па выключэнні выкарыстання аднаразовага посуду і аб сістэме вяртання спажывецкай упакоўкі. Гродзенцы таксама ідуць гэтым шляхам. Напрыклад, шклозавод выпускае тару з больш лёгкіх матэрыялаў, гандлёвыя прадпрыемствы пераходзяць на тару з паперы, Гродзенская тыпаграфія пачала выпуск папяровага посуду.

Яшчэ адно вострае пытанне датычылася карыстання мабільнымі тэлефонамі ў школах. Як вядома, праблема выйшла на дзяржаўны ўзровень. Згодна з загадам Міністэрства адукацыі па абмежаванні карыстання імі, у школах тэлефоны здаюцца на часовае захаванне ў спецыяльныя боксы. Па гэтым шляху пайшла і Гродзеншчына. Як адзначыў Уладзімір Краўцоў, у класах усталяваны месцы (звычайна на стале настаўніка), дзе знаходзяцца спецыяльныя боксы з ячэйкамі. У іх вучні кладуць свае гаджэты ў рэжыме «без гуку». У такім жа рэжыме тэлефон можа знаходзіцца і ў партфелі. Дарэчы, мабільныя прылады могуць выкарыстоўвацца педагогам у адукацыйных мэтах. Па словах Уладзіміра Краўцова, працэс абмежавання сродкаў мабільнай сувязі падчас заняткаў праходзіць без эксцэсаў.

На прэс-канферэнцыі было ўзнята рэзананснае пытанне па стыхійных дачах садовага таварыства «Хімік-Азот». Усяго такіх участкаў каля сотні, яны падлягаюць зносу. Члены таварыства нават напісалі зварот у Адміністрацыю Прэзідэнта. А між тым многія ўчасткі не афармлены дакументальна, частка іх пустуе. Згодна з планам горада, гэта зона гарадской забудовы, тут будзе пракладзена дарога пры рэканструкцыі чыгуначнага моста цераз Нёман, патлумачыў старшыня аблвыканкама. Да таго ж дачы знаходзяцца на камунікацыях завода, што таксама небяспечна. Для вырашэння праблемы створана рабочая група. Членам таварыства былі прапанаваны іншыя ўчасткі на тэрыторыі Гродзенскага раёна. І такіх свабодных участкаў каля тысячы. Некаторыя скарысталіся такім правам. Таксама ёсць магчымасць узаконіць і свае садовыя домікі, якія не падпадаюць пад знос.

Закранулі журналісты і тэму святкавання 500-годдзя Жыровіцкага манастыра. Урачыстасці з гэтай нагоды пройдуць 20 мая 2020 года. У гэты дзень будзе святкавацца і 550-годдзе галоўнай манастырскай святыні — іконы Жыровіцкай Божай Маці. Як паведаміў Уладзімір Краўцоў, сюды чакаецца прыезд многіх важных гасцей, магчыма, кіраўніцтва Беларусі і Расіі. Падрыхтоўка да свята вядзецца па спецыяльнай праграме на чале з рэспубліканскім аргкамітэтам. Запланавана правядзенне рэканструкцыі Брацкага корпуса, на гэтыя мэты накіруюць два мільёны рублёў. Адначасова Свята-Успенскі сабор, званіцу, цэнтральную плошчу. Цяпер вядзецца комплексная работа па добраўпарадкаванні Жыровіц: аднаўлены каля дзясятка аб'ектаў, у тым ліку дарогі. Да канца года плануецца ўсталяваць агароджу па вуліцы Саборнай, правесці мадэрнізацыю вулічнага асвятлення. Да святкавання юбілейнай даты перад уваходам у Жыровіцкі манастыр плануецца паставіць помнік архімандрыту Жыровіцкаму, прападобнаму Серафіму. Неабходныя дакументы сабраны і ўзгадняюцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Бяспека

# «Персанал і насельніцтва падрыхтаваны выдатна»

## Маштабнае вучэнне прайшло на Беларускай АЭС

**Эксплуатацыя любога патэнцыйна небяспечнага аб'екта непарыўна звязана з пытаннямі бяспекі. Атамнай электрастанцыі ў гэтым рэчышчы аддаецца асаблівая ўвага — хоць верагоднасць радыяцыйных аварый вельмі нізкая, але наступствы іх вельмі сур'ёзныя як па фінансавых, так і па часавых складніках. І на выпадак непрадбачанага трэба знайсці выйсце з як мага большай колькасці магчымых сітуацый загадзя. Таму 11 кастрычніка на пляцоўцы станцыі і побач з ёй разгарнулася буйнамаштабнае вучэнне з органамі кіравання, сіламі і сродкамі Гродзенскай абласной падсістэмы ДСНС па адпрацоўцы дзеянняў на выпадак радыяцыйнай аварыі на атамнай электрастанцыі.**



Фота БелТА.

— Планавыя мерапрыемствы паказалі нашу поўную гатоўнасць, — зазначыў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір КУХАРАЎ**. — Усё адбываецца выключна па правілах МАГАТЭ; прадстаўнік гэтай арганізацыі таксама прысутнічае на вучэннях. Мы на свае вочы ўбачылі, што ўсе службы аснашчаны належным чынам і гатовы да ліквідацыі магчымай надзвычайнай сітуацыі. Можна меркаваць, што бяспека жыхароў будзе цалкам гарантаваная.

Першыя такія буйнамаштабныя вучэнні прайшлі два гады таму. **Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА** зазначыў:

— Самае галоўнае — наладзіць узаемадзеянне. Персанал і насельніцтва падрыхтаваны выдатна, нягледзячы на тое, што пуск станцыі яшчэ не адбыўся. Усе ставіцца да сітуацыі з разуменнем. Інфармацыя перадавалася на цэнтр аператыўнага рэагавання МНС, звесткі паступалі ў камісію па надзвычайных сітуацыях пры Савеце Міністраў і прэм'ер-міністру. Пры неабходнасці будзе інфармаваны кіраўнік дзяржавы.

Больш падрабязна пра ход вучэнняў на Беларускай АЭС чытайце ў адным з наступных нумароў і неўзабаве на сайце.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Трагедыя

# ПАД КАЛУГАЙ ЗАГІНУЛІ СУАЙЧЫННІКІ

**Учора раніцай пасольства Беларусі ў Расіі пацвердзіла гібель чатырох нашых грамадзян у дарожна-транспартным здарэнні ў Калужскай вобласці. Пазней стала вядома, што колькасць ахвяр аварыі мікрааўтобуса павялічылася да пяці: адзін са шпіталізаваных пацярпелых у аварыі памёр у рэанімацыі.**

Пасля ДТЗ у бальніцу паступіла пяць грамадзян Беларусі. Дваіх пасля агляду адпусцілі на амбулаторнае лячэнне. Як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Беларусі Юлія Барадун, зараз у Калужскай абласной клінічнай бальніцы знаходзяцца тры пацярпелыя суайчыннікі, адзін з іх — у аддзяленні траўматалогіі. Яшчэ два з больш цяжкімі траўмамі, стан якіх стабільна цяжкі, — у рэанімацыйным аддзяленні. Як толькі беларускім грамадзянам стане лепш, будзе вырашацца пытанне аб іх транспарціроўцы на радзіму.

Аварыя адбылася 10 кастрычніка ў 16.20 на 202-м кіламетры аўтадарогі М3 «Украіна» ў Бабынінскім раёне. Згодна з папярэднімі звесткамі, кіроўца мікрааўтобуса Mercedes-Benz Sprinter, рухаючыся з боку Бранска ў Маскву, пры развароце сутыкнуўся з аўтамабілем Scania, які ехаў у спадарожным напрамку. Пасля гэтага мікраўтобус выцеце ў кювет.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Турцыя пачала ваенную аперацыю ў Сірыі



Ваенная аперацыя Турцыі «Крыніца міру» на поўначы Сірыі пачалася з авіяўдараў ваенна-паветраных сіл рэспублікі па пазіцыях курдскіх фарміраванняў «Сілы народнай самаабароны», якія Анкара лічыць тэрарыстычнымі. Самалёты нанеслі ўдары ў раёне населеных пунктаў Рас-эль-Айн,Тэль-Аб'яд, Эль-Камышлы і Айн-Іса. Аб пачатку аперацыі абвясціў прэзідэнт Турцыі Таіп Эрдаган. Па яго словах, мэта аперацыі «знішчэнне тэрарыстычнага калідора, які спрабавалі стварыць уздоўж мяжы рэспублікі, а таксама дасягненне міру і стабільнасці ў рэгіёне». «Мы захаваем тэрытарыяльную цэласнасць Сірыі і вызвалім мясцовыя супольнасці ад тэрарыстаў», — напісаў ён у «Твітэры». Узброеная кааліцыя «Сілы дэмакратычнай Сірыі» (SDF), супраць якой выступае Анкара, у адказ правяла мінамётны абстрэл памежных турэцкіх гарадоў і падпаліла шэраг нафтавых вышак у сірыйскай правінцыі Эль-Хасака. Раней курдскія атрады, якія ўваходзяць у кааліцыю, абвясцілі ўсеагульную мабілізацыю ў памежных раёнах. Калоны бежанцаў пакідаюць раён правядзення аперацыі. Паступаюць паведамленні аб ахвярах сярод мірнага насельніцтва. У Беларусі «з глыбокай заклапочанасцю сочаць за ростам напружанасці на паўночным усходзе Сірыі... Заклікаем у экстраным парадку вярнуцца да дыялогу», — адзначаецца ў заяве МЗС Беларусі.

### «Джаконда» вярнулася ў Луўр



Знакамітае палатно Леанарда да Вінчы «Мона Ліза» вярнулася ў парыжскі Луўр. Сваё звычайнае месца экспазіцыі — salle des Etats (зала дзяржаў) — карціна пакінула два месяцы таму, калі там пачаліся рамонтныя работы. На гэты час «Джаконду» перавезлі ў галерэю Медычы. Пасля вяртання яе чакаў новы фон: сцены памяшкання перафарбавалі з светла-жоўтага ў цёмна-сіні колер. «Таксама мы скарысталіся момантам, каб змяніць шкло, за якім карціна правяла 15 гадоў, каб абараніць «Мону Лізу». За гэтыя гады з'явіліся новыя тэхналогіі. Шкло само па сабе цалкам празрыстае і ствараe такое ўражанне, быццам вы знаходзіцеся вельмі блізка да карціны», — расказаў мастацтвазнавец і куратар музея Венсан Дэлевен. Змянілася і схема перамяшчэння па зале музея. Для наведвальнікаў арганізавалі дзве чаргі, каб кожны меў магчымасць разгледзець шэдэўр Леанарда да Вінчы з максімальна блізкай адлегласці. Штодня ў сярэднім 30 тысяч чалавек прыходзяць у Луўр, каб зірнуць на загадкавую ўсмешку «Моны Лізы».

### Іранскіх жанчын упершыню за 40 гадоў пусцілі на футбол



Тры з паловай тысячы іранскіх жанчын упершыню за без малога сорак гадоў змаглі паглядзець на стадыёне футбольны матч. Раней ім заходзіць на стадыёны было строга забаронена. ФІФА настаяла на адмене забароны пасля таго, як іранская балельшчыца, злоўленая пры спробе ўвайсці на стадыён у мужчынскім адзенні, падпаліла сябе перад будынкам суда з-за страху пераследу. Гістарычнай гульнёй стаў матч паміж зборнымі Ірана і Камбоджы, які іранская каманда выйграла з лікам 14:0. 3500 «жаночых» квіткоў, як паведамляецца, разышліся за лічаныя хвіліны. Адной з жанчын, што трапілі на матч, была спартыўная журналістка Рахав Пурбахш. «Я дагэтуль не веру, што гэта здарыцца. Усе гэтыя гады я глядзела гульні па тэлевізары, а цяпер убачу ўжывую», — сказала яна інфармацыйнаму агенцтву France-Presse перад гульнёй.

# СЯМ'Я Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

**Напярэдадні свята Дня маці ў сталіцы абмеркавалі мацярынскую місію жанчын, сямейнае чытанне як частку стратэгіі выхавання дзяцей і моладзі, а таксама ролю мастацкай літаратуры і СМІ ва ўмацаванні традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Давайце адыдзем крыху ад фармальных лічбаў, — прапанавала **старшыня Беларускага саюза жанчын, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Мар'яна ШЧОТКІНА.** — Бо ў жыцці кожнага чалавека няма нічога больш важнага за сям'ю, моцная сям'я — аснова любога грамадства, а з пункту гледжання сацыялогіі — гэта сацыяльны інстытут — самы маленькі, але самы моцны і надзейны. Для бацькоў створаны і замацаваны на заканадаўчым узроўні самыя спрыяльныя ўмовы, існуе 11 відаў матэрыяльнай дзяржаўнай падтрымкі мацярынства і дзяцінства... Спытайце любога чалавека, аб чым ён марыць — у адказе будзе прысутнічаць слова «шчасце», а шчасце ўключае ў тым ліку любоў, блізкіх людзей і, канешне, сям'ю. Безумоўна, трэба цаніць сваіх бацькоў — і маму, і тату, але сёння мы гаворым найперш пра ролю мамы. Нашы матулі вельмі моцныя і працавітыя, але і вельмі сціплыя, таму мы часам забываем пра тое, што ім неабходная падтрымка — з боку мужа і дзяцей, а таксама з боку грамадства і дзяржавы. Таму Беларускі саюз жанчын пастаянна ініцыюе і з'яўляецца ўдзельнікам новых праектаў па ўсебаковай падтрымцы жанчын-маці».

Адзін з такіх праектаў — сацыяльна-творчая акцыя «Сямейнае чытанне», у межах якога запланавана выданне серыі кніг беларускіх і замежных аўтараў, у тым ліку казак, пазнавальнай і іншай літаратуры для дзяцей і падлеткаў ад 3 да 14 гадоў. Зборнік з гэтай серыі народных казак «Не сілай, а розумам» ужо ўбачыў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура», і яго вельмі чакаюць, напрыклад, у дзіцячых і школьных бібліятэках. Акрамя таго, ужо традыцыйна ў кастрычніку ў розных гарадах Беларусі праходзіць не толькі дзень, але і Тыдзень, і Месяц маці — святочныя мерапрыемствы з удзелам шматдзетных сем'яў, матуль і бабуль, бацькоў, адноўленых у правах паводле Дэкрэта № 18, сем'яў, у якіх дзяцей выхоўвае толькі бацька... «Сэрца ёсць у кожнага чалавека, і яно павінна быць любячым, добрыя словы трэба спяшацца гаварыць, а добрыя справы — рабіць сёння, тут і цяпер», — нагадала Мар'яна Шчоткіна.

**Старшыня Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў Таццяна КРАЎЧАНКА** нагадала: амаль 30 гадоў таму, калі была ўтворана гэта арганізацыя, стаўленне грамадства і чыноўнікаў да шматдзетных сем'яў было рэзка адмоўным. Але з цягам часу Беларусь прыйшла да таго, што падтрымка мацярынства і дзяцінства стала адным з дзяржаўных прыярытэтаў: так, з 1996 года беларускія жанчыны, якія нарадзілі і выхоўваюць пяцёра і больш дзяцей, зноў ушаноўваюцца ордэнам Маці, а за мінулую пяцігодку амаль 74 тысячы шматдзетных сем'яў змаглі аформіць сямейны капітал, што паспрыяла росту нараджальнасці.

**Начальнік упраўлення медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Алена БОГДАН** адзначыла парадокс апошняга часу: калі большасць здаровай моладзі адкладвае нараджэнне дзяцей «на потым», то сем'і, у якіх адзін ці абодва бацькі з абмежаванымі магчымасцямі, са складанымі паталогіямі, альбо, напрыклад, хворыя на анкалогію — наадварот, адчуваюць павышаную патрэбу ў дзецях і не жадаюць чакаць. Намаганні медыкаў скіраваны на тое, каб захаваць кожную цяжарнасць і ўкараніць сістэму аказання медыцынскай дапамогі ўсім такім сем'ям. Дарэчы, у найбліжэйшы час будзе вынесена на грамадскае абмеркаванне Нацыянальная стратэгія планавання сям'і, якую распрацавалі прадстаўнікі розных ведамстваў і арганізацый.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

### Дарэчы

**Падчас круглага стала «Сямейнае чытанне як фактар выхавання падрастаючага пакалення» арганізатары ўзнагародзілі пераможцаў штогадовага рэспубліканскага творчага конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава». Сёлета ў ім удзельнічала 97 работ ад 81 рэдакцыі рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ: друкаваных і электронных выданняў, тэле- і радыёканалаў. Дыпломамі Міністэрства інфармацыі і ГА «Беларускі саюз жанчын» былі адзначаны рэдакцыі газет «Знамя юности», «Мінскі кур'ер», «Віцьбічы» і «Вячэрні Віцебск», «Воранаўская газета», ганцавіцкага раённага выдання «Савецкае Палессе», творчая група Другога нацыянальнага тэлеканала і карэспандэнт Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі Святлана Чарнова, тэлерадыёкампанія «Магілёў», Гомельскае гарадское радыё, фотакарэспандэнты «Голаса Касцюкоўшчыны» і гомельскай раённай газеты «Маяк». Шчыра віншуем калег з поспехам і жадаем ім, як, зрэшты, і журналістам, і чытачам «Звязды», яшчэ больш важных, нераўнадушных, цёплых і праблемных, словам, разнастайных і цікавых матэрыялаў сямейнай тэматыкі.**



# «Тата вернецца, калі ападуць усе лісцікі»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Мяне прызвалі ў войска леташняй вясной, — кажа Аляксандр. — Спярша трапіў у «вучэбку» ў Печы, пасля перавялі бліжэй да дому, у 120-ю брыгаду. Вельмі прыдаўся працоўны досвед, які я атрымаў яшчэ да арміі. Я працаваў старшым кладаўшчыком, у мяне на складзе была свая невялікая брыгада. Дзякуючы гэтаму было лягчэй разумець, як і што трэба арганізаваць. А задачы ў нас падчас вучэнняў былі часам такія, якіх у звычайным жыцці і не сустрэнеш. Напрыклад, на вучэнні «Шчыт Саюза — 2019», якое праходзіла ў верасні ў Расіі, нам трэба было замаскіраваць палатку так, каб яе не было бачна ні з зямлі, ні з паветра. Быў я і ў ахове пункта кіравання брыгадай.

Пасля арміі Аляксандр збіраецца займець сваю справу. Кажа, што хочацца ўдасканальваць арганізатарскія навыкі і далей. Але гэта справа будучыні. Цяпер жа вельмі важна не губляць сувязі з домам, дзе яго чакаюць тры родныя чалавекі.

— Амаль штодня гутару па мабільным тэлефоне або з жонкай і сынам, або з мамай. Хрысціна з Ванем імкнуцца прыязджаць кожныя выхадныя, тым больш што тут зусім недалёка. Я ж расказваю ім не толькі пра тое, як праходзяць дні ў войску, але і пра тое, чаму я навучыўся. Напрыклад, Ваня вельмі любіць слухаць, як распаліць самому вогнішча падчас паходу, як арыентавацца ў лесе, як здабыць там ваду.

Маці Аляксандра, Алена Валянцінаўна, згадвае адно цікавае супадзенне. 23 лютага мінулага года, на Дзень абаронцаў Айчыны, тады яшчэ трохгадовы Ваня зняўся ў салдацкай форме. І роўна праз два дні з яго бацькам звязаліся з ваенкамата. Аляксандр прайшоў медыцынскую камісію, дзе яго прызналі прыдатным да службы. Так і пачаліся яго 18 месяцаў у войску.

— Я тады сказала Хрысціне: не ведаю, як твайму мужу, але майму сыну дакладна не перашкодзіць. Я ж яго гадавала адна, мужчынскага выхавання ён не бачыў. Пэўныя адбіткі гэта накладвае. Праўда, ён заканчваў клас з ваенным ухілам, таму сказаць, каб армія была цалкам нечым новым, было б нельга.

Алена Валянцінаўна больш перажывала за сям'ю свайго сына. Унуку Ваню тады акурат споўнілася тры гады. І ўсё так атрымалася, што на работу Хрысціну не бралі некаторы час, а дапамогу на дзіця ўжо не плацілі. І дзе браць грошы, калі муж акажацца ў войску? Ён жа не даваў ёй разгубіцца, пастаянна падбадзёрваў. І неўзабаве маладая маці здолела працаўладкавацца.

— Ведаеце, вакол такога паняцця, як «маці салдата», існуе вельмі шмат стэрэатыпаў, — працягвае маці Аляксандра. — Можа, калі б сын пайшоў служыць у 18 гадоў, мне было б цяжэй. Ён жа хацеў паступаць у Ваенную акадэмію, але не склалася... Праўда, напэўна, спярша розніца ва ўзросце крыху кідалася ў вочы. Усё-такі пераважная большасць служыць у войску або ў 18—19 гадоў, або пасля заканчэння ўніверсітэта.



Чакаць кагосьці мне не ўпершыню. У маёй сям'і служылі ўсе. Брата лёс закінуў у Ціксі. Іншыя сваякі трапілі на Байканур. Вось гэта — адлегласць. Тут жа ад дома да часці — лічаныя кіламетры. І нават тыя Печы блізу Барысава непараўнальна бліжэйшыя за якуцкае марское ўзбярэжжа або казахстанскія пустыні. І вось на рабоце мне ўсе казалі: «Ну, рыхтуйся кожныя выхадныя ездзіць». Я кажу: «А навошта туды ездзіць? Яго накармілі, напаілі, абулі, адзелі. Сувязь з ім ёсць. Кожныя выхадныя прыязджае жонка з сынам». Камусьці штосьці даказваць — а навошта гэта? Я лічу, што трэба дарослым дзецям даць волю. Каб яны адчулі, што дзяцінства скончылася, яны ўжо па-за сваім домам, і дзякуючы гэтаму зразумелі, што ж такое маці. Тым больш Саша да войска ўжо тры гады жыў з жонкай асобна ад мяне. І разумення таго, што сын можа не заўжды быць побач, прыйшло задоўга да яго прызыву ў войска.

Алена Валянцінаўна наведвае сына прыблізна раз на месяц. Здаралася, што прыязджала не толькі па выхадных, але і пасля работы. Вельмі запомнілася прысяга, якую Аляксандр прымаў у Печах.



— Гэта быў вельмі ўзрушальны момант. Але як жа пазнаць свайго сына, калі там некалькі тысяч салдат, яны ўсе аднолькавыя і адрозніваюцца толькі ростам? І вось на пальцы аднаго з юнакоў бліснула кольца. Я прыгледзелася — ды гэта ж Саша! І калі нядаўна былі сумесныя расійска-беларускія вучэнні, мы з Хрысцінай і Ванем не прапускалі ніводнага тэлесюжэта адтуль. Усё чакалі ўбачыць сына, мужа і бацьку на вялікім экране. Але, на жаль, так і не здарылася.

Пытаюся ў Хрысціны: як жа гэта — адчуваць сябе жонкай салдата?

— Мне было нязвыкла. Галоўнае — трымаць сябе ў руках, таму што ўвесь негатыў будзе адначасова адбівацца на мужу. А гэта ні для кога добра не будзе. Ну і добра, я — чалавек дарослы, праўда, з арміі нікога не чакала раней, нават не ведаю, што гэта такое. А як растлумачыць трохгадоваму сыну, куды дзеўся бацька на 18 месяцаў? Таму мы сталі з ім ездзіць кожныя выхадныя ў госці. І тата для Вані — аўтарытэт. Хлопчыку вельмі падабаецца ваенная тэматыка — і шкарпэткі, і майкі... Сам просіць іх купіць.

— І гармата ў мяне не ваенная, — дадае з дзіцячай непасрэднасцю Ваня, круцячы цацку ў руках.

— Першы раз мы прыехалі да Сашы праз паўтара тыдні пасля таго, як яго адправілі ў войска, — працягвае Хрысціна. — Першыя паўгода Ваня сумаваў моцна. Я, як магла, яго суцяшала. Сын жа з нецярпеннем чакаў чарговай паездкі да таты. Вельмі любіць есці разам з ім. А сёлета Саша сказаў яму, што вернецца, калі ападуць усе лісцікі. І вось кожны дзень Ваня пачынае з таго, што падыходзіць да акна і глядзіць на дрэвы.

Да звальнення Аляксандра Пракопчыка ў запас засталося не так і шмат — усяго паўтара месяца. І сотні лісцікаў, якія штодня павольна адрываюцца ад сваіх дрэў...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Мы гэта можам!

# МАМЫ Ў ТРЭНДЗЕ


Святлана Немірка — педагог, псіхолаг, фітнес-трэнер.

**ЭНЕРГІЧНАЯ, прыгожая, паспяховая... Актыўная мама — гэта не толькі трэнд, але і жыццёвая неабходнасць у сучасным свеце.**

**Святлана НЕМІРКА** — сацыяльны педагог, псіхолаг, а цяпер яшчэ і фітнес-трэнер з дзесяцігадовым досведам. Магчымасць быць дзейнай і карыснай прыносіць бойкай і тэмпераментнай маладой жанчыне пачуццё задавальнення — такі спадарожнік сапраўднага шчасця. Святлана заўсёды імкнулася рабіць тое, што дадае радасці не толькі ёй, але і іншым. Сёння яна шчаслівая жонка, мама дваіх дзяцей, а ў прафесійнай сферы лічыць сябе паспяховай: вядзе агульную фізічную падрыхтоўку ў маленькіх хакеістаў, індывідуальны трэнер па плаванні і фітнес-трэнер для матуль у дэкрэце. Дарэчы, ім яна дапамагае не толькі прыйсці ў жаданую форму, але і падчас трэніроўкі заставацца побач са сваімі дзецьмі.

**«Адцягнулі на хвіліну сваю ўвагу ад трэніроўкі, дагналі дзіця, выдалі пячэньку — і зноў назад працаваць над сваёй формай».**

— У спорт я прыйшла выпадкова, — прызнаецца Святлана. — Пасля звычайнай трэніроўкі да мяне падышла кіраўнік аднаго фітнес-клуба, які я наведвала, і прапанавала стаць трэнерам — маўляў, талент ёсць. Не ведаю, як яна гэта ўбачыла *(смяецца)*. Вырашыла, што паспрабую... Скончыла спецыяльныя курсы і стала працаваць трэнерам. Вось тады і адчула сябе на сваім месцы.

Калі першай дачцэ Святланы споўнілася чатыры месяцы, жанчына вырашыла вярнуцца на работу — пачала даваць індывідуальныя ўрокі плавання. Калі дачцэ споўнілася паўгода, Святлана вырашыла заняцца і сабой.

— Вось тут і паўстала пытанне, на каго ў гэты час пакідаць дачку, — успамінае Света. — Ну, адзін раз на бабулю, другі — на дзядулю, трэці — на тату... Але ж трэніроўкі не былі рэгулярныя, а я кожныя заняткі інтуітыўна спяшалася дадому, да малой. Аднойчы абставіны склаліся так, што на трэніроўку я прыйшла з дачкой. Яна спала ў калясцы, а я спакойна трэніравалася. У той момант і адчула, што найшла для сябе выйсце.

Пасля нараджэння другога дзіцяці Святлана падзялілася сваім досведам з сяброўкай, якая таксама даглядала немаўля. Тая ўхапілася за гэтую ідэю і стала ўгаворваць Святлану дапамагаць мамам у дэкрэце прыйсці ў форму: маўляў, ты ж трэнер...

— Першыя заняткі былі на вуліцы, у Лошыцкім парку Мінска, — расказвае Святлана. — Мы прыходзілі туды з каляскамі. Гэта было вельмі зручна, бо дзеці гулялі побач ці спалі на свежым паветры ў калясках, а мамы трэніраваліся.



Спачатку матуль было няшмат. Але ў хуткім часе сфарміравалася паўнавартасная група, якая наведвала трэніроўкі рэгулярна.

— Нам удалося выбудаваць ідэальную сістэму для мам — аматараў спорту ў дэкрэце, — расказвае Святлана. — Па-першае, жанчыне не трэба купляць абанемент загадзя. Гэта зручна, таму што жыццё мамы падпарадкаванае інтарэсам маленькіх карапузаў. Калі дзіця захварэла, капрызіць ці не выспалася — яна проста не прыходзіць. Таму адзаймаліся — заплацілі. Немагчыма прадказаць да апошняга моманту, колькі жанчын прыйдзе.

Трэніроўка з дзіцем — справа асаблівая. Не бывае так, што маці робіць спартыўнае практыкаванне, а малое сядзіць побач. Дзеці бегаюць, цікавяцца, гуляюць у мячыкі, раптам хтосьці з іх можа заплакаць ці ўцёкі зладзіць, або туалет запатрабаваць... Усе ставяцца да гэтага з разуменнем. Адцягнулі на хвіліну сваю ўвагу ад трэніроўкі, дагналі дзіця, выдалі пячэньку — і зноў назад працаваць над сваёй формай.

— Неўзабаве дзеткі прызвычаіліся адно да аднаго і проста пачалі гуляць разам, — успамінае Святлана. — А калі надышоў час ісці ў садок, то нашы малыя былі самыя падрыхтаваныя: ведалі, як сябраваць, чым сябе заняць, а дзе трэба падзяліцца цацкай, а дзе адстойваць свае інтарэсы...

Калі надышла восень і пахаладала, заняткі на вуліцы сталі некамфортныя. Але жанчынам не хацелася спыняць трэніроўкі. Тады трэнер пайшла ў самую найбліжэйшую спартыўную залу і расказала аб сваёй незвычайнай групе кіраўніку.

— Самая вялікая праблема для мамы ў дэкрэце — гэта набыць адразу абанемент, — гаворыць Святлана. — Бо ў жанчыны сёння грошы ёсць — яна прыйшла, заўтра няма — не прыйшла. Гэта акалічнасць бянтэжыла кіраўніка залы. Але ўсё ж вырашылі паспрабаваць, і ў нас атрымалася.

Трэнер стварыла групу ў сацсетках, дзе жанчыны паведамляюць, хто прыйдзе, хто не. Звычайна прыходзіць не менш, чым чатыры мамы, але не больш, чым восем. Трэніроўкі замацавалі сувязь паміж імі. Жанчыны знаёмяцца, потым разам ходзяць піць гарбату, віншуюць адна адну са святамі, а некаторыя знаходзяць сапраўдных сябровак.



— Жанчыны, якія да нас прыходзяць, падобныя тым, што ім хочацца быць актыўнымі, — гаворыць Святлана. — Для іх важна сачыць за сваім здароўем, важна мець зносіны з аднадумцамі.

Трэніравацца ходзяць і шматдзетныя матулі, і жанчыны, якія маюць аднаго-двух дзетак. Трэнер лічыць, што яны ўвогуле нічым не адрозніваюцца, напэўна, толькі тым, што шматдзетныя больш спакойна ставяцца да дзіцячых свавольстваў.

Нягледзячы на тое што падчас трэніроўкі малыя нярэдка адцягваюць на сябе ўвагу, нагрузкі для мам лічацца паўнавартаснымі.

— Калі жанчына ходзіць больш-менш рэгулярна, то вынік бачны, — тлумачыць трэнер. — Бывае, што прыходзіць жанчына, калі яе немаўляці ўсяго паўгода. Я абавязкова сачу за такімі рэчамі: тут неабходна размяркоўваць пэўным чынам нагрузку. Такія жанчыны выконваюць практыкаванні ў павольным тэмпе, без спартыўнага абсталявання. Я працую, можна сказаць, індывідуальна, бо групы невялікія.

Святлана лічыць гэтую незвычайную групу сваёй «сацыяльнай» нагрузкай — больш для душы, бо на мамах у дэкрэце асабліва не зарабіш. Ёй падабаецца не толькі дапамагаць ім прыйсці ў форму пасля родаў, але і назіраць, як на яе вачах у жанчын завязваецца сяброўства. Сама Святлана выйшла з дэкрэтнага адпачынку, яе дзеці наведваюць дзіцячы садок. Некаторыя жанчыны з першых набораў таксама пайшлі ўжо працаваць і не наведваюць трэніроўкі. Аднак група не змяншаецца. Прыйшло новае папаўненне, і атмасфера даверу, узаемнай прыхільнасці і аднадумства ў «мама-групе» засталася.

**«Аднойчы абставіны склаліся так, што на трэніроўку я прыйшла з дачкой. Яна спала ў калясцы, а я спакойна трэніравалася. У той момант і адчула, што найшла для сябе выйсце».**

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**



З нагоды

## Нашым любімым

**Акцыю пад назвай «Цеплыню сэрцаў — мамам» правёў канцэрн «Беллегпрам».**

На базе Клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці старшыня канцэрна Таццяна Лугіна, дарэчы, сама маці дваіх сыноў, павіншавала жанчын, якія нарадзілі дзяцей у гэтыя дні. Адметна, што кожная з маладых матуль атрымала падарунак з вырабаў беларускіх прадпрыемстваў, што ўваходзяць у склад «Беллегпрама»: трыкатажную коўдру ад фабрыкі «Палессе» (Пінск) і кубачак ад Добрушскага фарфоравага завода. У межах мерапрыемства канцэрн «Беллегпрам» і Клінічны радзільны дом Мінскай вобласці падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. Яно прадугледжвае ўзаемадзеянне прадпрыемстваў канцэрна і грамадскага аб'яднання «Крыніца цеплыні», зарэгістраванага на базе раддома, у некалькіх кірунках.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Сёмае неба

## Сустрэлі 4-мільённага пасажыра за год...

**у Нацыянальным аэрапорце Мінск. Ім аказаўся пасажыр рэйса № BRU8923 авіякампаніі «Белавія» па напрамку Мінск — Шарм-Эль-Шэйх, паведамілі на авіяпрадпрыемстве.**

У параўнанні з мінулым годам сёлета Нацыянальны аэрапорт абслужыў чатырохмільённага пасажыра на месяц раней. Тады названая планка была пераскнута 12 лістапада. За верасень жа гэтага года колькасць абслужаных у Нацыянальным аэрапорце Мінск самалёта-вылетаў склала 2602, што на 10,5 працэнта перавысіла вынікі работы за аналагічны перыяд мінулага года. У верасні аэрапорт абслужыў 501 816 пасажыраў, прырост склаў 11 працэнтаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Здарэнне

## «Дарагая» сяброўка

**Яе візіт скончыўся знікненнем буйной сумы.**

Міліцыянеры Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 27-гадовую жыхарку Мінскай вобласці, якая выкрала 1,8 тысячы долараў у сваёй сяброўкі, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. З заявай аб знікненні грашовых сродкаў да праваахоўнікаў звярнулася 26-гадовая мінчанка, растлумачыўшы, што тыя зніклі з кватэры, калі яна была на рабоце. Сышчыкі ўстанавілі, што грошы скрала знаёмая гаспадыні жылля, якая прыехала да яе пагасцяваць на пару дзён. Супрацоўнікам міліцыі затрыманая растлумачыла, што, знаходзячыся ў гасцях, даведалася, дзе яе сяброўка хавае грошы. Пакуль дома нікога не было, дзяўчына забрала іх і накіравалася па пакупкі. Набыўшы ўсё неабходнае, з'ехала да сябе дадому ў Жодзіна, дзе астатнюю суму выдаткавала на аплату крэдытаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

Предмет аукциона:
**Торговое помещение,** общ. пл. **214,2 кв. м**, инв. № **130/D-4369**, по адресу: **Брестская обл., г. Пинск, ул. Советская, д. 2.**
Начальная цена с НДС 20 % – **163 200,00 бел. руб.**
**Обременение: договор аренды.** Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество,** установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 04.09.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **05.11.2019** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **01.11.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Узденский» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:
**Лот № 1 (53/17): баня, инв. № 623/С-58260, общей площадью 179,2 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625683205301000099 площадью 0,1500 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Костюки, ул. Центральная, 1А** *(земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона Лошанского водохранилища, площадь – 0,1500 га).* Земельный участок принадлежит продавцу на праве аренды до 2066 г.
**Условия продажи:** проведение реконструкции (строительства) объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 3 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество. В случае невыполнения указанного обязательства покупатель должен будет обеспечить снос объекта либо осуществить его продажу.
**Начальная цена объекта с НДС (20 %) – 17 466,74 бел. руб.** *(стоимость снижена на 20 %).* **Задаток 10 % от начальной цены (1 746,00 бел. руб.).**
**Лот № 2 (55/18): здание бани, инв. № 623/С-58834, общей площадью 176,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683200004000008 площадью 0,2587 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, 9** *(земельный участок имеет ограничения прав в использовании: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, площадь – 0,2587 га).* Земельный участок принадлежит продавцу на праве постоянного пользования.
**Условия продажи:**
1. Улучшить эстетический вид Объекта: ремонт входных дверей, частичная замена кровли, установка окон, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания Объекта, и наведение на нем порядка в течении 3 месяцев с момента подписания акта приема-передачи Объекта.
2. Разработать проектно-сметную документацию, провести проектно-изыскательские работы в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством.
3. Провести реконструкцию (строительство) Объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект, если иное не установлено решением Узденского районного исполнительного комитета.
4. Ввести Объект в эксплуатацию в течение 3 лет с момента заключения договора купли-продажи, если иное не установлено решением Узденского районного исполнительного комитета.
5. Использовать земельный участок в строгом соответствии с действующим законодательством.
6. Запрет на отчуждение Объекта до его ввода Покупателем в эксплуатацию.
7. Поддерживать надлежащее санитарное, техническое состояние Объекта и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) Объекта до его сноса (гибели).

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 27 613,42 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены **– 2 761,00 бел. руб.**)
**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2018, 17.05.2019, по лоту № 2 опубликованы в газете «Звязда» от 18.10.2018, 17.05.2019. Аукцион состоится **30.10.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.10.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНП 600002438

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «РСУ «Мясомолоко» г. Слуцк (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом недвижимого имущества в составе:
**здание пилорамы (РБУ)** *(составные части и принадлежности: пристройка, хозпостройка)* с инв. № **640/С-27979** общей площадью **869,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Ленина, 292Е;**
**здание трансформаторной подстанции** с инв. № **640/С-27981** общей площадью **35,3 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Ленина, 292Е/1 (далее – объекты).**
Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **624650100001007264** площадью **0,3964 га** (право постоянного пользования) по адресу: **Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 292е.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: водоохранная зона реки Случь площадью 0,3964 га.*
**Условия продажи:**
1. Наведение на земельном участке, отведенном для обслуживания Объекта, порядка в течение одного месяца с момента подписания сторонами акта о приеме-передаче.
2. Поддерживать надлежащее санитарное, техническое состояние Объекта и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) Объекта до его сноса (гибели).
3. В случае отсутствия необходимости изготовления проектно-сметной документации: в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект (в случае отчуждения объекта, государственная регистрация создания которого не производилась, – с даты подписания акта о приеме-передаче) проинформировать Слуцкий районный исполнительный комитет об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ.
4. В случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектно-сметной документации (проектирование, возведение, реконструкция, реставрация, капитальный ремонт, благоустройство либо снос): обратиться в Слуцкий районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ не позднее шести месяцев с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект (в случае отчуждения объекта, государственная регистрация создания которого не производилась, – с даты подписания акта о приеме-передаче); начать разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в течение одного месяца с даты получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ.
5. Осуществить реконструкцию (строительство), реставрацию, капитальный ремонт, благоустройство либо снос Объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, если иное не установлено решением Слуцкого районного исполнительного комитета.
6. Использовать земельный участок в соответствии с действующим законодательством.
7. Запрет на отчуждение Объекта до выполнения Покупателем условий договора купли-продажи (за исключением случаев отчуждения, передачи без перехода права собственности объекта Покупателем, являющимся физическим лицом, созданному им субъекту хозяйствования, либо использования объекта при регистрации физического лица в качестве индивидуального предпринимателя).

Начальная цена объектов с НДС (20 %) **– 141 360,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены **– 14 136,00 бел. руб.**
**Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **14.11.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.11.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНП 600154328

**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки бланков с определенной степенью защиты № 2019-753164**, размещенной на сайте **http://www.icetrade.by** по «Полиграфическая деятельность / издательская деятельность > Бланки / книги учета».

УНП 100357923

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 212 24-63-14, +375 29 510-07-63.
**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 57-85-08.
**Лот № 1**. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. №200/U-86275, площадью – 888 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17 Б/4, готовность строения – 46 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86269, площадью – 449,5 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17 Б/1, составные части и принадлежности: две пристройки, готовность строения – 42 %, готовность двух пристроек – 62 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86271, площадью – 288,6 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17 Б/ 3, составные части и принадлежности: крыльцо, готовность строения – 68 %, готовность крыльца – 100 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86273, площадью – 4722,8 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17 Б/ 2, готовность строения – 39 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86266, площадью – 1296,1 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17 Б, составные части и принадлежности: пристройка, навес, готовность строения – 47 %, готовность пристройки – 52 %, готовность навеса – 74 %. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000003000151 (договор аренды земельного участка по 14.08.2030) площадью 3,9294 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17 Б, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания автотранспортного предприятия. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
**Начальная цена**: 1 979 564,22 бел. руб. без учета НДС. Задаток 197 956,42 бел. руб.
**Лот № 2.** Кап. строение (одноэтажное металлическое здание склада газобалоннов (площадка 3) с инв. № 200/С-72741 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/1, площадью 173 кв. м, наименование – склад газобаллонов (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (одноэтажное кирпичное здание КПП-18) с инв. № 200/С-71772 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/4, площадью – 22 кв. м, наименование – КПП-18, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-78666 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, участок железной дороги Лучеса-Придвинская, 5 км, станция Журжево, подъездной железнодорожный путь № 33, протяженность – 299,8 м, наименование – подъездной железнодорожный путь № 33, назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, составные части и принадлежности: участок подъездного железнодорожного пути № 33, расположенное на зем. участках с кадастровыми № № 240100000003007151, 240100000001000255, 240100000003007556. Кап. строение с инв. № 200/С-101966 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, телефонная канализация к зданиям № № 64В, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность линейного сооружения – 343,3 м, наименование – телефонная канализация, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101967 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, водопровод хозпитьевой к зданиям № № 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 780,1 м, наименование – водопровод хозпитьевой, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101971 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, канализация хозфекальная от зданий № № 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 445,4 м, наименование – канализация хозфекальная, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101972 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, наружное освещение вблизи зданий № № 64В, 64В/1, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность линейного сооружения – 429,4 м, наименование – наружное освещение, назначение – сооружение специализированное энергетики, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101973 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, склад ГСМ вблизи здания № 64В, наименование – склад ГСМ, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, составные части и принадлежности: емкость, емкость, емкость, емкость, молниеотвод, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101974 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, канализация ливневая от зданий №№ 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 970,6 м, наименование – канализация ливневая, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-102120 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, наружная теплотрасса к зданиям № № 64В, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность – 306,9 м, наименование – наружная теплотрасса, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: шесть участков сети, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное панельное здание складского корпуса № 1 (площадка 3) с рампой) с инв. № 200/С-72898 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В, площадью 2920 кв. м, наименование – складской корпус № 1 (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное смешанной конструкции здание складского корпуса № 2 с рампой) с инв. № 200/С-72749 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/2, площадью 2396 кв. м, наименование – складской корпус № 2 (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное кирпичное здание склада ОМТС с бытовыми помещениями (корпус 3)) с инв. № 200/С-72750 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/3, площадью 1883 кв. м, наименование – склад ОМТС с бытовыми помещениями (корпус 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101970 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64 В, благоустройство территории, площадью 13216 кв. м, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение, трое ворот, две калитки, две крановые эстакады, громоотвод, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 88400321, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-1,0 с инв. №88400318, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В/1. Кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 95400420 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В/2. Кран мостовой опорный электрический с кабиной 10-5К-14-12-У1 с инв. № 92400397, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-3,2 с инв. № 85400217, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-3,2 с инв. № 85400198, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-5 с инв. № 86400234, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-5 с инв. № 86400235, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В. Имущество расположено на: земельный участок с кадастровым № 240100000001000255 (право постоянного пользования) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В; земельные участки с кадастровыми № № 240100000003007151 (право аренды), № 240100000003007556 (право аренды) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64.
**Лот № 2 продается при условии продажи Лота № 1. В случае проведения нерезультативных торгов по Лоту № 1, Лот № 2 снимается с торгов.**
**Обременение по лотам № 1 и № 2:** запрещение совершения регистрационных действий. Разрешение управления принудительного исполнения Главного управления юстиции Витебского облисполкома от 29.07.2019 на проведение аукциона при условии перечисления денежных средств покупателем от покупки лота № 1 и лота № 2 на депозитный счет Управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома.
**Начальная цена**: 2 557 517,45 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток** 255 751,74 бел. руб.
**Дата, время и место проведения аукциона:** 12.11.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 12.10.2019 с 08.30 по 11.11.2019 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с** ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. **Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**
**Условия аукциона**: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить затраты по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона (в т. ч. затраты по оценке имущества) на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплатить предмет торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. НДС от цены продажи имущества уплачивается сверх стоимости объекта.
**Аукцион проводится** в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: +375 (212) 24-63-14, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Класныя навіны

# СУПРАЦОЎНІЦТВА — ДЛЯ БУДУЧЫНІ

## У EdCamp Belarus — 2019 возьмуць удзел замежныя мегазоркі педагогікі

**Трэцяя (не)канферэнцыя беларускіх педагогаў EdCamp Belarus — 2019 пройдзе ў сталічным бізнес-клубе «Імагуру» 12—13 кастрычніка. Яе ідэйнымі натхняльнікамі і арганізатарамі выступаюць Мінскі хаб глабальных архітэктараў будучыні (Global Shapers) і Таварыства беларускай школы.**



**EdCamp (Education Camp) — міжнародная ініцыятыва, якая нарадзілася сярод настаўнікаў ЗША і распаўсюдзілася па ўсім свеце. На сённяшні дзень больш за 1500 мерапрыемстваў у 35 краінах свету аб'ядналі 120 000 настаўнікаў і тых, хто зацікаўлены ў паляпшэнні адукацыйнага працэсу, для адкрытага абмену педагагічным вопытам, супрацоўніцтва і вырашэння агульных задач. Беларусь тры гады таму стала 26-й краінай свету, якая далучылася да EdCamp-супольнасці.**

Мэтай (не)канферэнцыі з'яўляецца стварэнне нефармальнай творчай пляцоўкі для школьных настаўнікаў па абмене ідэямі і вопытам і далейшым супрацоўніцтве для прафесійнага росту.

Для ўдзелу ў EdCamp Belarus было пададзена больш як 430 анкет, але запрашэнні атрымалі толькі 200 беларускіх педагогаў, паколькі фізічныя магчымасці «Імагуру» не дазваляюць размясціць на яго плошчах усіх ахвотных. Летась, каб паслухаць некаторых спікераў, педагогі размяшчаліся... на падлозе на дыванах, бо ў памяшканні не хапала месца для крэслаў. Гэта стала падставай для жартаў, але ніхто не застаўся пакрыўджаным.

У EdCamp Belarus — 2019 прымуць удзел эксперты з Вялікабрытаніі, Польшчы, Чэхіі, Украіны і нават Японіі.

— У Мінск прыедзе з выступленнем адзін з самых уплывовых педагогаў у свеце Рос Морысан МАКГІЛ, — расказвае **намеснік старшыні Таварыства беларускай школы, кіраўнік партала nastaunik.info Тамара МАЦКЕВІЧ.** — 12—13 кастрычніка ён дасць некалькі майстар-класаў для беларускіх настаўнікаў. Рос Морысан Макгіл — не проста вядомы настаўнік, а таксама вядомы пісьменнік і блогер. Яго сайт https://www.teachertoolkit.co.uk рэгулярна ўваходзіць у топ-100 самых карысных педагагічных рэсурсаў і мае каля 10 мільёнаў чытачоў. Рос Морысан Макгіл намінаваўся газетай The Sunday Times у 500 самых уплывовых людзей у Вялікабрытаніі. Больш за 25 гадоў працаваў настаўнікам (быў «Настаўнікам года Вялікабрытаніі» ў 2004 годзе) і кіраўніком у адной з самых складаных лонданскіх школ. Рэгулярна выступае на міжнародных кангрэсах у Вялікабрытаніі, Канадзе, Германіі, Іспаніі і іншых краінах. Цяпер працуе над доктарскай дысертацыяй па педагогіцы ў Кембрыджскім універсітэце.

Яшчэ адзін наш спікер — Данута СТЭРНА, эксперт Цэнтра грамадзянскай адукацыі з Варшавы. Працавала навуковым супрацоўнікам Варшаўскага тэхналагічнага ўніверсітэта, з 1990 года — настаўнікам матэматыкі ў дзяржаўных і прыватных школах, аўтар публікацый для выкладчыкаў і метадычных матэрыялаў для настаўнікаў школ, трэнер праграмы SUS («Школа, якая вучыцца»), кіраўнік Акадэміі SUS. Данута Стэрна займаецца перападрыхтоўкай настаўнікаў у Польшчы і ў Беларусі. Гэта наш даўні сябар, і прыход у беларускія школы актыўнай ацэнкі звязаны менавіта з ёй. Данута з'яўляецца аўтарам кнігі «Фарматыўная ацэнка на практыцы».

З нецярплівасцю чакаем мы ў Мінску і Аліну ВАЎРАНЮК — настаўніцу школы № 4 з Беластока, якая выкладае беларускую мову ў пачатковых класах. Аліна — заснавальніца і актыўная ўдзельніца грамадскай арганізацыі «АБ-БА» — аб'яднання на карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову, аўтар трох падручнікаў для пачатковай школы, галоўны рэдактар альманаха «Беларускі настаўнік», які выходзіць у Беластоку на беларускай мове. Як практык, Аліна Ваўранюк зрабіла дзясяткі праектаў для вучняў і разам з вучнямі і іх бацькамі, звязаных з медыя і медыяперсонамі.

За сваю адукацыйную і грамадскую дзейнасць для захавання культурных традыцый і мовы беларусаў Падляшша ўзнагароджана медалём «Заслужаны дзеяч польскай культуры», а ў 2013 годзе атрымала ад прэзідэнта Польшчы ўзнагароду «Сярэбраны крыж заслугі». На Edcamp Belarus Аліна Ваўранюк будзе дзяліцца сваім вопытам супрацоўніцтва з бацькамі, раскажа, як з дапамогай навучальных праектаў, асабліва медыйных, можна спрыяць павышэнню матывацыі вучняў да вучобы, іх культурнай і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі.

Агульная тэма для EdCamp Belarus — 2019 — «Супрацоўніцтва для будучыні». Прафесар Джон Хэці — аўтар самых аўтарытэтных даследаванняў пра ўплыў на эфектыўнасць навучання, сцвярджае, што супрацоўніцтва паміж настаўнікамі мае самы моцны эфект сярод фактараў, якія ўплываюць на якасць навучання, ён утрая большы, чым сацыяльны статус навучэнца або стварэнне элітных школ і адмысловых праграм.

Але, безумоўна, візітнай карткай педагагічнай (не)канферэнцыі з'яўляецца Кірмаш педагагічных ідэй. У кожнага з ахвотных будзе 60 секундаў, каб прэзентаваць сваю ідэю. Падчас першага беларускага Эдкемпа ў 2017 годзе педагогі прапанавалі амаль 20 сваіх тэм. Летась было агучана ўжо 40 ідэй.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Арт плюс

# Лекі супраць няведання

## У Беларусі стартавала інфармацыйная кампанія #МастацтвадляЗдароўя, прымеркаваная да Міжнароднага дня барацьбы са СНІДам

**10 кастрычніка Вялікі тэатр Беларусі і Еўрапейскі фонд Рудольфа Нурыева падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве з Аб'яднанай праграмай ААН па ВІЧ/СНІДзе (ЮНЭЙДС) у Беларусі. У гэты ж дзень у нашай краіне ўзяў пачатак маштабны праект #ARTforHealth — #МастацтвадляЗдароўя, які фінішуе акурат 1 снежня дабрачынным спектаклем «Ор і Ора» ў пастаноўцы Аляксандры Ціхамiравай. Частка грошай ад продажу білетаў на гэты балет будзе перададзена Міністэрству аховы здароўя Беларусі для суправаджэння людзей, якія жывуць з ВІЧ.**

Адна з Мэт устойлівага развіцця, абвешчаных ААН, — спыненне эпідэміі СНІДу. Гэтага выніку неабходна дасягнуць да 2030 года. Спецыялісты мяркуюць, што тэрмін можна скараціць, калі ісці да мэты сумеснымі намаганнямі. «Трэба працаваць і па-за межамі сферы аховы здароўя, — упэўнены **рэгіянальны дырэктар ЮНЭЙДС для краін Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі Віней САЛДАНА.** — Бо перамога над СНІДам — агульная задача не толькі для медыцыны, а для ўсяго грамадства». Таму ў Беларусі ў размову пра прафілактыку і ранняе выяўленне хваробы разам з урачамі ўключыліся і грамадскія арганізацыі, і прадстаўнікі бізнесу, і дзеячы мастацтва.

Важнасць праблемы безумоўная: эпідэмія СНІДу ўжо забрала жыцці 37 мільёнаў людзей ва ўсім свеце. У велічэзным сумным спісе — адзін з самых вядомых рок-музыкантаў у гісторыі, франтмен гурта Queen Фрэдзі Мерк'юры, легендарны артыст балета Рудольф Нурыеў, мастак Кейт Харынг, акцёр Энтані Перкінс, пісьменнік-фантаст Айзек Азімаў і іншыя. Каля 36 мільёнаў жыхароў Зямлі сёння жывуць з ВІЧ-інфекцыяй, прытым многія з іх наогул не ведаюць уласны ВІЧ-статус. Дыскрымінацыя і стыгма ВІЧ-пазітыўных людзей перашкаджаюць многім, хто сумняваецца, прайсці тэст і рэгулярна прымаць лячэнне. Паводле слоў **першага намесніка міністра аховы здароўя Беларусі Дзмітрыя ПІНЕВІЧА,** у нашай краіне, паводле ацэначных лічбаў, каля 21 тысячы чалавек з прыблізна 24 тысяч ВІЧ-пазітыўных ведаюць пра свой статус і атрымліваюць належную тэрапію: «Аднак пакуль ёсць хоць адзін чалавек, які не ўпэўнены ў сваім ВІЧ-статусе і не праходзіць эфектыўнае лячэнне, наша работа павінна працягвацца».

Уласна, якраз інфармаванне беларусаў пра ВІЧ-інфекцыю і магчымасці антырэтравіруснай тэрапіі і стане задачай Вялікага тэатра ў межах кампаніі #ARTforHealth, дзе ART — і мастацтва, і медыцынская абрэвіятура. З 10 кастрычніка да 1 снежня тут правядуць серыю семінараў па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі, майстар-класы для аматараў балета, медыямарафон у сацсетках, а таксама збор дабрачынных сродкаў — паўдзельнічаць у ім можа кожны, хто набывае білеты на культурныя імпрэзы з дапамогай kvitki.by. Дзякуючы фонду Рудольфа Нурыева ў Мінску пройдзе адкрыты паказ сёлетняга фільма Рэйфа Файнса «Белы воран» і сустрэча з выканаўцам галоўнай ролі Алегам Івенкам, які ўвасобіў на экране вобраз Нурыева, а таксама выстаўка фотаздымкаў славутага танцора, прадстаўленая адным з музеяў Францыі. Прыгожым фіналам — але ні ў якім выпадку не заканчэннем супрацоўніцтва, адзначаюць у тэатры — стане балет «Ор і Ора» на музыку Міхаіла Крылова. «Ужо невылечна хворым Нурыеў прыязджаў у Санкт-Пецярбург і выступаў на сцэне Марыінскага тэатра, — згадвае **балетмайстар-пастаноўшчык Вялікага тэатра Беларусі Аляксандра ЦІХАМІРАВА.** — Гэта быў сапраўдны подзвіг, дэманстрацыя сілы духу. Наш спектакль — таксама пра сілу духу. І мы вельмі ганарымся, што ўдзельнічаем у падобнай акцыі. Бо мастацтва заўжды стаіць вышэй за палітыку, вышэй за любыя адрозненні паміж людзьмі...»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Футбол

# РЭАЛІЗАЦЫЯ = ВЫНІК

## У матчы кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы — 2020 зборная Беларусі не змагла перамагчы эстонцаў, згуляўшы ўнічыю 0:0

**Галоўны трэнер нашай каманды Міхаіл МАРХЕЛЬ** адзначыў, што гульня атрымалася такая, як і чакалі. «Было важна рэалізаваць моманты. У першым тайме гульня не атрымалася ў плане дзеянняў у атацы. У другім мы старалiся ўнесці карэктывы, у тым ліку і заменамі. Моманты былі, лічу, што мы заслугоўвалі перамогі. На жаль, гэта быў не наш дзень. Рэалізацыя трошкі нас падвяла, таму такі і вынік. Па створаных момантах, якасці гульні мы выглядалі мацнейшымі за эстонцаў. Калі ў Таліне атрымалася забіць пераможны гол, то тут не атрымалася».



«Мы таксама хацелі забіць. У першым тайме мелі добры шанц. Але ў гэтай гульні план быў такі, каб згуляць прагматычна, — каментуе сустрэчу **галоўны трэнер зборнай Эстоніі Карэл ВОАЛАЙД.** — У першым матчы супраць беларусаў, дома, хацелі паказаць больш атакуючы футбол, які падабаецца гледачам, але тут стараліся дзейнічаць прагматычна. Ведаю, гэта не вельмі прыгожы футбол, але не думаю, што мы ламалі гульню беларусаў. Я павінен быць задаволены, гледзячы на выніковы лік і на тое, як мы гулялі. Так, беларусы маглі забіваць, мелі моманты. Таму мы задаволены набранымі ачкамі».

У нядзелю зборная Беларусі на дамашнім полі сустрэнецца з галандцамі. Міхаіл Мархель адзначыў, што часу на падрыхтоўку да матча вельмі мала, але каманда пастараецца выціснуць з гэтых дзён максімум. «У нейкай ступені трэба, напэўна, асвяжыць склад. Сама сутнасць, тактыка, стратэгія гульні з Нідэрландамі будзе адрозніваца ад гульні з эстонцамі. Зыходзячы з гэтага і пабудуем падрыхтоўку», — дадаў галоўны трэнер.

Цяпер нашы футбалісты знаходзяцца на 4-й пазіцыі з 4 ачкамі пасля шасці гульняў. Нагадаем, у фінальную частку Еўра-2020 выйдуць па дзве найлепшыя каманды з 10 кваліфікацыйных груп, а таксама чатыры пераможцы плэй-оф Лігі нацый УЕФА.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Будзь у курсе!

## БІЛЕТЫ НА ЦЯГНІКІ — ПА СІСТЭМЕ ДЫНАМІЧНАГА ЦЭНАЎТВАРЭННЯ

**Беларуская чыгунка з 10 кастрычніка адкрывае продаж праязных дакументаў на цягнікі міжнародных ліній № 39/40 Полацк — Масква, № 96/95 Брэст — Масква і з 25 кастрычніка для цягніка № 76/75 Гомель — Масква (з улікам групы Брэст — Масква — цягнікоў № 676/76 — 75/675) у купэйныя вагоны і вагоны СВ з выкарыстаннем сістэмы дынамічнага кіравання тарыфамі ў міжнародных зносінах.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, асноўнымі крытэрыямі пры фарміраванні тарыфу з выкарыстаннем сістэмы з'яўляюцца ўзровень працэнта занятасці месцаў у вагоне адпаведнага тыпу і тэрміны набыцця праязных дакументаў (білетаў) пасажырамі. Па меры росту працэнта запаўняльнасці вагона кошт праезду паступова ўзрастае. Пералік каэфіцыента занятасці месцаў у вагоне адпаведнага тыпу і кошту праезду ажыццяўляецца ў анлайн-рэжыме пры кожным новым афармленні ці вяртанні праязных дакументаў. Такім чынам, сістэма дасць магчымасць пасажырам пры своечасовым планаванні паездкі афармiць праязныя дакументы са зніжкай да 25 % у залежнасці ад маршруту руху. Так, напрыклад, пры афармленні праязнога дакумента (білета) у купэйны вагон па маршруце Мінск — Масква адпраўленнем 8 снежня кошт праезду са зніжкай складзе 108,73 рубля.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ СЕНСАЦЫІ, «ПАПУЛЯРНЫ» ДОК І ГРУЗІНСКІЯ АКЦЭНТЫ

## «Лістапад» абвясціў конкурсныя праграмы

**ГЛЯДЗЕЦЬ — не пераглядзець. 26-ы Мінскі міжнародны кінафестываль, што пройдзе з 1 да 8 лістапада пад слоганам «Да радасці», на гэтым тыдні абвясціў конкурсныя праграмы ігравога і дакументальнага кіно — уласна кажучы, усіх сваіх конкурсаў апроч Нацыянальнага. Форум, што кожны год рыхтуе некалькі эксклюзіўных кінападборак і факусуецца на краінах былой камуністычнай прасторы, паказваючы, што яна з сябе ўяўляе, гэтым разам прадэманструе 154 карціны з 50 краін.**

Гэты фокус з'яўляецца галоўнай фішкай «Лістапада». Пакуль у паралельных секцыях ідуць фестывальныя хіты, новыя работы славутых рэжысёраў і ўвогуле карціны з усяго свету, Асноўныя конкурсы ігравога і дакументальнага кіно робяць агляд прасторы, якую некалі аб'ядноўвала адна ідэалогія. Краіны былога сацыялістычнага лагера і Кітай гэтым разам паўстануць у дванаццаці ігравых і трынаццаці дакументальных фільмах.

* * *

«Гэтая секцыя — тое, дзеля чаго «Лістапад» і задумваўся, — прадстаўляе праграмы дырэктар Ігар Сукманаў Асноўны конкурс ігравога кіно. — Мы жывем у зменлівым свеце, дзе праблемы Кубы, Кітая, Польшчы, Румыніі, Венгрыі, Грузіі аб'ядноўваюць нас, бо з гэтымі краінамі, можа, тэрытарыяльна і далёкімі, мы маем агульнае гістарычнае мінулае. Нам хацелася б, каб конкурс адлюстраваў усе болевыя пункты, уласцівыя гэтым грамадствам, і разам з тым увявіў сабой галерэю славы сучаснага кінамастацтва».

Магчыма, першы ЛГБТ-фільм на грузінскай мове «А потым мы танцавалі», зняты шведскім грузінам Леванам Акінам пра двух маладых танцораў грузінскіх народных танцаў, сустрэўся з супрацівам яшчэ з часу здымак, але быў прадстаўлены ў адной з секцый Канскага кінафестывалю і, па словах Ігара Сукманава, выклікаў там фурор.

У Асноўным конкурсе «Лістапада» карціна будзе адной з трох знятых грузінскімі рэжысёрамі. Уладальнік Гран-пры Шанхайскага кінафестывалю фільм «Удых-выдых» Дзіта Цындадзэ і «Злачынны чалавек», які адсылае да Дастаеўскага, Дзмітрыя Мамуліі (прэм'ера апошняга адбылася ў Венецыі) дапоўняць грузінскі акцэнт.

Адзін з самых правакацыйных і скандальных расійскіх аўтараў Валерыя Гай Германіка паўдзельнічае ў конкурсе з містычнай фантазіяй «Мысленны воўк», а адным з герояў карціны «Басаногі бягун» ужо вядомага мінскаму гледачу Мірлана Абдыкалыкава з'яўляецца трактар «Беларус». З нецярпеннем варта чакаць новай карціны балгарскіх аўтараў Петра Вылчанава і Крысціны Грозевай «Бацька». Работа гэтых аўтараў «Урок» у свой час атрымала галоўную ўзнагароду «Лістапада», а «Слава» стала ўладальнікам Прыза глядацкіх сімпатый.

«На які высокі ўзровень духоўнага асэнсавання жыцця могуць падняцца хіпстары», паказвае адна з самых важных карцін сучаснага польскага кіно «Цела Божае» Яна Камаса. У Асноўны конкурс увайшоў таксама адзін з самых спрэчных фільмаў кінасезона з Чэхіі «Размаляваная птушка» Вацлава Маргоўла, які падзяляе гледачоў на два лагеры. Чорна-белую амаль трохгадзінную карціну, прэм'ера якой адбылася на Венецыянскім кінафестывалі, параўноўваюць з фільмам «Ідзі і глядзі» Элема Клімава. «Фільм узрушвае натуралізмам і праводзіць гледача праз пекла ад пачатку і да канца, але вядзе да радасці», — кажа Ігар Сукманаў.

Важнае імя сучаснай украінскай кінематаграфіі адкрые адна з галоўных сенсацый сёлетняга Венецыянскага кінафестывалю — карціна «Атлантыда» Валянціна Васяновіча. А кітайскае кіно на конкурсе будзе прадстаўлена работай «карыфея і жывога класіка» Вана Сяашуая «Бывай, сын мой», дзе падрабязна, з 70-х гадоў да нашага часу, прасочваецца гісторыя адной сям'і. «Фільм пра тое, як жорны гісторыі спрабуюць зламаць людзей, але яны застаюцца незгінальныя, прычым на месца галоўных герояў можна паставіць любога беларуса».



**Кадр з фільма «Стрыптыз і вайна» Андрэя Куцілы.**

* * *

Асноўны конкурс дакументальнага кіно ўключыў у сваю праграму фільм «Стрыптыз і вайна» Андрэя Куцілы, і гэта галоўнае на сёння. Леташні «Лістапад» суправаджаўся скандалам, выкліканым прызнаннем у тым, што Міністэрства культуры не дазволіла паказаць у Нацыянальным конкурсе некалькі адабраных дырэкцыяй карцін. Сярод іх была і гэта работа Андрэя Куцілы, між іншым, лаўрэата найпрэстыжнейшага фестывалю дакументальнага кіно IDFA ў Амстэрдаме.

Фільм, што здымаўся чатыры гады, паказвае сумеснае жыццё ў адной кватэры дзядулі, падпалкоўніка авіяцыі ў адстаўцы, і ўнука-стрыптызёра. Беларускі глядач пакуль не меў магчымасці ўбачыць на вялікім экране адну з галоўных дакументальных беларускіх работ апошняга часу, таму рэабілітацыя «Лістапада» тут вельмі дарэчы.

Яшчэ адным беларускім удзельнікам конкурсу стане свежая карціна Віктара Аслюка пра ўчастковага «Абход». «Па-першае, гэта работа аднаго з вядучых беларускіх рэжысёраў, што працуюць у дакументальным кіно, — тлумачыць свой выбар **праграмны дырэктар Ірына ДЗЯМ'ЯНАВА.** — Па-другое, яна зроблена на «Беларусьфільме». Па-трэцяе, фільм завершаны толькі-толькі, таму мог бы трапіць у рубрыку «Сусветная прэм'ера», калі б яна ў нас была».

На 26-м «Лістападзе» гэты конкурс будзе паказвацца ўжо не ў «Міры», а ў кінатэатры Silver Screen у Galileo. Несправядліва недаацэненае гледачом дакументальнае кіно стала вымагаць меншых залаў і камерных прастор. Тут жа будуць адбывацца сустрэчы з аўтарамі і іншыя мерапрыемствы кшталту канцэртаў. «Ігравое таксама, але дакументальнае кіно ў абсалютнай ступені павінна выклікаць гледача на размову, таму што яно расказвае пра нас з вамі, прадстаўляе непрыдуманыя гісторыі і паказвае тое, што, умоўна кажучы, адбываецца за акном і ў суседнім пакоі», — кажа Ірына Дзям'янава.

Вытворчасць фільмаў Асноўнага конкурсу дакументальнага кіно мае больш шырокую геаграфію, але ўсё роўна расказвае пра краіны постсацыялістычнага лагера. «Мы адбіраем карціны, што дыхаюць асаблівым паветрам гэтых краін і перадаюць асаблівы нерв нашага жыцця, якое, на жаль, не заўсёды прыстасаванае да радасці».

Пераезд у Silver Screen спалучаецца і з пэўным падыходам да фарміравання сёлетняй праграмы. «Мы больш уважліва, чым у мінулыя гады, арыентаваліся на рэакцыю гледачоў і думалі, як чалавек прыйдзе, упершыню, можа быць, паглядзіць дакументальнае кіно і на яго адрэагуе. Адкрыю сакрэт: калі трэба было выбраць паміж фільмам у эксперыментальнай манеры, пра які можна пагаварыць з крытыкамі і прафесіяналамі, і гісторыямі, здольнымі зацікавіць многіх, мы выбіралі другое. Таму ў праграме ёсць эмацыянальныя, маляўнічыя, вясёлыя, іранічныя, смешныя работы, якія ўсё яшчэ апроч эмацыянальнага ўздзеяння прымусяць задумацца і «зрабіць паўзу ў словах».

Нельга не пагадзіцца, што сучасны глядач мае пэўную прадузятасць да неігравога кіно як да менш відовішчнага. Напэўна, «Лістападу» сапраўды трэба дазволіць сабе некалькі кампрамісаў, каб спачатку прыцягнуць увагу да дакументалістыкі, а ўжо потым паказаць усе яе магчымасці.

* * *

Ужо без геаграфічных абмежаванняў, але па пэўных канцэпцыях складаюцца іншыя конкурсы «Лістапада». «Маладосць на маршы», як звычайна, уключае ў сябе першыя і другія карціны рэжысёраў і часцяком паказвае будучых зорак аўтарскага кіно. У свой час у конкурсе ўдзельнічала работа «Апантанасць», а праз нейкі час яе рэжысёр Дэм'ен Шазэл на ўвесь свет прагрымеў фільмам «Ла-ла-лэнд». У конкурс увайшлі дванаццаць карцін, сярод якіх работы з Германіі, Ірана, Ізраіля, Украіны, Тайваня, Аўстрыі, Чылі ды іншых краін. Амаль усе аўтары прыедуць у Мінск, каб прадставіць свае работы і пакамунікаваць з беларускай публікай.

«Гэта карціны, якія нам хацелася прадставіць з пункту гледжання не толькі звышсуровай драматычнай рэальнасці, але і спроб аўтараў працаваць у абсалютна розных кірунках, напрыклад, у складаным і няўдзячным жанры драмедзі. Мы таксама хацелі зрабіць акцэнт на так званым жанравым кіно, бо для аўтараў гэта не заўсёды лёгкая задача, таму каб правадка да радасці, трэба будзе прайсці праз церні», — каментуе Ігар Сукманаў.

У конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» увайшлі стужкі з Канады, Індыі, Нарвегіі, Кітая і іншых краін. «Гэта праграма, што ўключае ў сябе толькі сем карцін, — адна з самых складаных на «Лістападзе». Дзяцінства і юнацтва — імклівы час, за кароткі прамежак успрымманне свету змяняецца некалькі разоў. Нам было важна ўкласці ў гэтыя сем карцін розныя дзіцячыя пачуцці, каб даць маленькі п'едэстал маленькаму чалавеку і дапамагчы юным гледачам крыху глыбей і танчэй успрымаць рэальнасць».

Дакументальнае кіно можна будзе пагледзець і ў Конкурсе нацыянальных кінашкол, у якім удзельнічаюць карціны, створаныя студэнтамі. «Для многіх удзельнікаў конкурсу гэта першая магчымасць убачыць свой фільм на вялікім экране ў сапраўдным кінатэатры. Амаль дзесяць гадоў свайго існавання конкурс факусаваўся на задачы стаць не экзаменам для маладых кінематаграфістаў, а майстэрняй», — кажа **каардынатар конкурсу Марыя КАСЦЮКОВІЧ.** У ім возьмуць удзел студэнты з пятнаццаці адукацыйных устаноў Польшчы, Эстоніі, Даніі, Ізраіля, Іспаніі, Фінляндыі і іншых краін. У праграму ўвайшла і работа студэнткі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — «Мой французскі дзядзька» Анастасіі Лашкевіч.

На будучым тыдні «Лістапад» мае абвясціць, якія фільмы ўвайшлі ў Нацыянальны конкурс і якіх хітоў чакаць у пазаконкурсных секцыях.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

**Паказы Асноўнага конкурсу ігравога кіно, Асноўнага конкурсу дакументальнага кіно, Нацыянальнага конкурсу, «Маладосці на маршы», «Лістападзіка», Конкурсу нацыянальных кінашкол і пазаконкурсных секцый будуць праходзіць на шасці пляцоўках — у кінатэатрах «Цэнтральны», «Піянер», «Беларусь», Falcon Club Буцік Кіно, Silver Screen у Galileo і Музеі гісторыі беларускага кіно. Цырымоніі адкрыцця і закрыцця па традыцыі апошніх гадоў адбудуцца ў кінатэатры «Масква». Білеты на кінапаказы стануць даступныя 21 кастрычніка. Ад «Лістападзіка» да начных сеансаў у «Цэнтральным» іх кошт будзе вар'іравацца ад 2,5 да 7 рублёў, на паказы ў Falcon Club Буцік Кіно можна будзе трапіць за 8 рублёў, а на вячэрнія фільмы ў Silver Screen — за 6 рублёў. Праход на цырымоніі адкрыцця і закрыцця каштуе 20 рублёў.**

Асоба

# Альгірдас ЛАТЭНАС: «Тэатр добры, калі ёсць сцэнічная праўда, а не жыццёвая»



**Шмат гадоў Альгірдас Латэнас кіраваў Маладзёжным тэатрам Літвы. Беларускі глядач мог бачыць яго спектаклі на міжнародных фестывалях у Мінску, а шмат хто памятае пастаноўку рэжысёра «Макбет» у Купалаўскім. У новым сезоне заслужаны артыст Літвы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР супрацоўнічае з Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатрам і прадстаўляе на яго пляцоўцы спектакль «Дарагая Памэла» паводле п'есы амерыканскага драматурга Джона Патрыка. Прэм'ера, што адбылася 2 кастрычніка, стала падставай пагаварыць з рэжысёрам пра магчымасці тэатра ў сённяшнім свеце.**

***— Вы выбіралі п'есу для пастаноўкі з разліку на трупу? Ці хацелася расказаць гісторыю незвычайнай гераіні небанальнымі сродкамі, як гэта робіць у літоўскім тэатры?***

— Я першы раз працаваў з гэтым калектывам. Мне хацелася зрабіць з ім спектакль, разлічаны на розныя пакаленні гледачоў і каб гэта была не чыста псіхалагічная або бытавая пастаноўка, а ўсё ж з некаторай метафарычнасцю. Я люблю, калі насычанасць нейкіх сцэн дазваляе зрабіць малюнак, нібыта застылы на шкле: ваду і паветра мароз раптам злучае ў мудрагелістым узоры, які знікае пад раніцу, раставаючыся ў промнях сонца. Колькі я ні бачыў спектакляў паводле гэтай п'есы, як правіла, яны сыходзілі ў пашлаватую камедыю. А мне здаецца, што ў гэтай гісторыі вельмі шмат Чэхава: сур'ёзнасць думак, якія ў ёй гучаць, не перашкаджае іранічнаму погляду на тое, што адбываецца. Мне падабаецца нават у шэкспіраўскіх трагедыях адшукваць, дзе можа быць смешна. А тут усё, як у жыцці, побач: вось чалавек хлусіць, а вось ён ужо добры і нават у чымсьці раскайваецца. Тут ёсць пра што гаварыць. Але ёсць яшчэ і сама Памэла — быццам нейкі шаман, жыццё якога накіравана на людзей. Страціла ўсё — мужа, дзіця, дом. Але звяртаецца з пасланнямі да найлепшага сябра, які стаіць над усімі намі: «Ты казаў, што самае цяжкае — верыць у людзей і дапамагаць ім. Я стараюся рабіць тое, чаму ты вучыў». Яна тут як пасол лепшага свету. Але складанасць у тым, каб не паказваць яе занадта ўзнёсла, таму што яна рэальная і нерэальная ў той жа час. Ёсць нейкі дуалізм у гэтым вобразе. Здаецца, што гэта павінна быць пабытавая гісторыя. Але мы стараемся сціснуць спружыну пабытавага існавання, каб яна, расціскаючыся, стала антыпобытавай. І тады ў ёй у сканцэнтраваным выглядзе змяшчаецца шмат: і побыт, і вышэйшыя матэрыі, калі мы адчуваем, што нас не пакінулі тут адных.

***— Ці было разуменне з боку нашых акцёраў у працэсе работы?***

— Мне здаецца, акцёры ў любой краіне не хочуць застыць на пабытавым рэалістычным тэатры, усе хочуць новых формаў. Работа з артыстамі залежыць больш ад таго, ці здольны рэжысёр дамовіцца з імі. Не заўсёды атрымліваецца лепш, калі працуеш з тымі, хто цябе ведае больш. Часам акцёры, ведаючы тваю стылістыку або метады, чакаюць мінулых знаходак, а ты ў гэты момант шукаеш нешта новае. Хочацца заўсёды ісці разам — і ў няведанне, і да знаходак. Вельмі часта акцёры жадаюць, каб ім сказалі, што яны павінны рабіць. Не, лепш разам стаць на п'едэстал або разам гінуць.

***— У гэтым спектаклі, напэўна, важная думка, якую хочацца трансляваць. Бо сама п'еса можна і рассмяшыць, і прабіць на слязу.***

— Павінна быць і тое, і іншае. Мне цяпер вельмі імпануе стэндапаўская накіраванасць. Гэта не значыць, што ў тэатры трэба рабіць так, як яны. Але ў нас таксама задача ў тым, каб захапіць залу сваёй энергетыкай. А калі добры стэндап, то ў ім і лёгкасць, і глыбіня, і за душу ён бярэ, і думаеш, як разумна зроблена. У ім усё злучаецца — і чорнае, і белае. І праз гэта нарастае напружанне: як быццам набліжаешся да ядра, якое вось-вось выбухне. А калі яно выбухае, раптам з'яўляецца Сусвет. Мне здаецца, тэатру да гэтага трэба ісці. Я шмат эксперыментаваў у гэтым кірунку са студэнтамі Акадэміі тэатра і музыкі Літвы — каб і рух, і ўсе формы мастацтваў сышліся. Таму і курс я збіраў адпаведны: усе павінны былі іграць, спяваць, а яшчэ і нейкімі інструментамі валодаць. Шмат працавалі над рухамі — ад класічнага да сучаснага танца, ад пантамімы да акрабатыкі. Я вельмі ўдзячны свайму курсу, які сёлета выпусціўся, што яны вытрымалі такую нагрузку. Але мне было неверагодна цікава з імі працаваць. Іх усіх узяў Каўнаскі тэатр.

***— У літоўскага тэатра ёсць свае традыцыі, свой твар. Ёсць імёны, якія яго зрабілі...***

— У свой час гэта была анамалія — што ў маленькай прасторы раптам з'явілася шмат цікавых асоб у тэатры. Чаму так здарылася, складана выказаць здагадку. Наш тэатр доўгі час трымаўся на тых, хто актыўна працаваў яшчэ да атрымання незалежнасці Літвой і пасля гэтай падзеі. А цяпер гэтыя імёны сыходзяць. Адчувальная страта Эймунтаса Някрошуса... Акрамя таго, ёсць тэндэнцыі, якія выклікаюць трывогу. Сорак гадоў я займаюся тэатрам, бо думаю, што гэта трэба людзям. Але цяпер у нас новыя ідэі і захопленасць формай. Прыходзяць новыя формы, нейкія плыні, якія патрэбныя, можа быць, не столькі шырокай публіцы, колькі маленькай групе людзей, паглынутых толькі сваімі інтарэсамі. Рымас Тумінас не проста ж так з'ехаў... Значыць, чагосьці не хапала на радзіме. У культуры ўсё больш выразна праяўляецца захопленасць формамі, пры гэтым, на жаль, траціцца змест.

***— Літоўскіх рэжысёраў любяць у іншых краінах, і ў вас ёсць пастаноўкі не толькі на радзіме. Чым цікавая работа ў іншай тэатральнай прасторы?***

— Маё бачанне тэатра не застылае, я спадзяюся, бо мастацтва павінна існаваць у развіцці. Але тэндэнцыі, якія я бачу, мяне зусім не радуюць. Гэта нібыта па Дастаеўскім, калі Фама Фаміч сказаў генералу: «Тое, што ты ведаеш, я ўжо сто разоў забыў». Тое, што хтосьці ўбачыць як новае, я даўно ведаю. Апошнія гады ў Літве з-за фармальных пошукаў вынішчаецца акцёрскае майстэрства. А мне трэба, каб акцёр магутна працаваў у спектаклі, але ў той форме, як я бачу. Гэтыя два складнікі павінны сыходзіцца і трывала счапляцца, быццам зубчыкі гадзіннікавага механізма. А цяпер шмат спекуляцый на псеўдарэжысуры, форме. Прыходзіць глядач у тэатр — працярпеў, не сышоў, але больш сюды не прыйдзе. Мне цікавы такі тэатр, у якім могуць быць розныя формы, але глядач пасля спектакля павінен сказаць: я раней не ведаў гэтага, але цяпер буду хадзіць у тэатр. Запрашэнні і выезды ў іншыя краіны мне цікавыя: адчуваю, што тут людзям гэта трэба. Інакш не клікалі б. Але па кантактах з акцёрамі ў Беларусі — у Брэсце, у Купалаўскім тэатры, маладзёжным — і ў Літве я не адчуваю розніцы. Усюды маглі быць рэжысёры, якія і тут, і там працавалі б паспяхова.

***— Беларускі тэатр усё ж застаецца больш традыцыйным...***

— Ён і ў нас традыцыйны. Колькі паламана дзідаў, колькі было размоў пра тое, як сысці ад побыту ў тэатры. А пачынаецца рэпетыцыя, і тыя, з кім ты толькі што размаўляў, выходзяць — і як у жыцці, як у эцюдах па Станіслаўскім. Але ж у кожным спектаклі свая рэальнасць, свая метафізіка. Можна несці высокую ідэю, але яна можа быць знішчана татальным побытам. Як кажуць: мастацтва там, дзе «ледзь-ледзь». Павінны быць паўтоны, нейкі вугал, пад якім мы глядзім на жыццё.

***— Адзін скажа, што добры тэатр — рэалістычны, другі — скіраваны на сімвалізм, трэці будзе чакаць эксперыменту. І ўсе маюць рацыю. Што такое добры тэатр для вас?***

— Тэатр добры, калі ёсць сцэнічная праўда, а не жыццёвая. Ад жыццёвай праўды мы адштурхоўваемся, а на сцэне вырастае нешта большае, дзе ёсць тое самае амаль няўлоўнае «ледзь-ледзь». Калі сцэнічную праўду спектакля ўдалося намацаць, то яна становіцца большай праўдай, чым у жыцці. Тады яна нават вучыць. Калі спектакль падабаецца, з яго нешта можна і ў жыццё ўзяць.

***— У вас асабіста такое здаралася?***

— Калі б не было тэатра, я не ведаю, ці быў бы я цяпер жывы. Таму што я рос складаным падлеткам, на мяне вельмі ўплывала вуліца, усякае магло здарыцца... Тэатр прымусіў мяне вучыцца жыць. Таму што ў ім сышліся розныя навукі, тут добрая літаратура, якой для мяне не існавала (гэта ж для дзяўчынак, думаў я). А аказалася, што ўсё на ёй трымаецца: па ёй можна вывучаць псіхалогію, этыку, эстэтыку...

Ведаю пра выпадак, калі спектакль выкупілі праграмісты. Дарослыя людзі з асаблівым мысленнем і разуменнем жыцця прыйшлі ў тэатр першы раз і ўбачылі даволі сярэдні спектакль. Але такі, што прабівае на слязу. Яны былі ўражаныя. Яны працуюць на камп'ютары з гульнямі, дзе персанажы маюць па шэсць жыццяў. А тут раптам збоку пагледзелі, як героі існуюць, пакутуюць ці радуюцца, і зразумелі, што жыццё ў кожнага адно і памерці можна па-сапраўднаму. Вакол і на сцэне — жывыя людзі, жывыя вочы. Тэатр, напэўна, гэтым і добры.

***— Што павінна быць у тэатры, каб ён выконваў сваю задачу перад людзьмі?***

— Я магу казаць пра сябе. Калі бяру п'есу, то думаю не пра тое, каб самавыявіцца, і не важна, як гэта ўспрыме публіка, як адрэагуюць людзі. Я ўвесь час думаю пра гледачоў — і маладых, і старэйшых, каб яны знайшлі агульныя тэмы, чалавечыя, маглі б размаўляць адно з адным. А цяпер усё так падзелена, наваколны свет як быццам заточаны пад моладзь — бо гэта ж страшна, калі чалавека ў 35-40 гадоў ужо на работу не бяруць... У грамадстве ўсе пакаленні важныя. Чым моцная сям'я? Калі дзіця расце, а ў яго ёсць і тата, і мама, і бабуля з дзядулем, а яшчэ калі прабабулі жывыя, яно тады абаронена па максімуме. Тады ў яго тонкае цела — душа — без дзірак. А сыходзяць блізкія — і ў душы з'яўляюцца дзіркі. А калі браць пад увагу меркаванне толькі аднаго пакалення, якое лічыць, што ўсё ведае, тады мы апынаемся з дзіркамі на ўзроўні грамадства. У нейкіх дзіўных пошуках цяпер людзі ўсёй зямлі. І дзе б ні жыў, ва ўсіх адны і тыя ж праблемы...



**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Начальная цена предмета аукциона (BYN) | Сумма задатка (BYN) | Расход. по подг. земел.-кадастр. док. (BYN) | Наличие ограничений и охранных зон на земельном участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | Хмелевский с/с, **аг. Хмелево**, ул. Озерная, 1А | 122583605101000269 | 0,2499 | 4 109,61 | 800,00 | 2 007,40 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади;<br>– охранная зона связи и радиофикации на площади 0,0168 га |
| 2 | Хмелевский с/с, **аг. Хмелево**, ул. Озерная, 1Б | 122583605101000270 | 0,2500 | 4 111,25 | 800,00 | 1 596,59 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади;<br>– охранная зона связи и радиофикации на площади 0,0191 га |
| 3 | Хмелевский с/с, **д. Соколово**, ул. Центральная, 16 | 122583604601000115 | 0,2500 | 3 960,00 | 700,00 | 1 331,05 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) на всей площади;<br>– на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади;<br>– в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0042 га;<br>– в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения на площади 0,0675 га |
| 4 | Хмелевский с/с, **д. Соколово**, ул. Центральная, 24 | 122583604601000116 | 0,1279 | 1 747,27 | 300,00 | 1 279,07 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) прудов, на всей площади;<br>– на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади;<br>– в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0030 га |
| 5 | Ленинский с/с, **аг. Ленинский,** ул. Гагарина, 3 | 122581502601000265 | 0,2478 | 14 253,21 | 2800,00 | 1 619,53 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади |
| 6 | Ленинский с/с, **д. Шелухи,** ул. Центральная, 26 | 122581505601000028 | 0,2080 | 1 830,40 | 300,00 | 1 597,12 | ограничений в использовании земель нет |
| 7 | Ленинский с/с, **д. Чижевщина,** ул. Центральная, 45Г | 122581505101000191 | 0,2500 | 4 550,00 | 900,00 | 1 587,97 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки, водоема) р.Тростяница на всей площади;<br>– в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0025 га;<br>– на мелиоративных землях на площади 0,1920 га |
| 8 | Ракитницкий с/с, **д. Федьковичи,** ул. Абрикосовая, 8 | 122582404601000236 | 0,1656 | 2 094,84 | 400,00 | 1 294,88 | – в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0052 га |
| **9** | Ракитницкий с/с, **д. Замошаны,** ул. Центральная, 11А | 122582402101000087 | 0,1097 | 1 625,75 | 300,00 | 1 543,42 | – в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0020 га;<br>– в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт на площади 0,0163 га;<br>– охранная зона объектов газораспределительной системы на площади 0,0035 га |
| 10 | **г. Жабинка,** ул. Белорусская, 9 | 122550100001002731 | 0,1460 | 11 271,20 | 2200,00 | 1 707,55 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Жабинка) на всей площади;<br>– на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади |
| 11* | **г. Жабинка,** ул. Береговая, 2 | 122550100001002732 | 0,1500 | 3 432,75 | 600,00 | 1 277,61 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Муховец) на всей площади;<br>– на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади;<br>– в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0002 га |
| 12* | **г. Жабинка,** ул. Береговая, 4 | 122550100001002733 | 0,1500 | 3 432,75 | 600,00 | 1 277,61 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Муховец) на всей площади;<br>– на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади;<br>– в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0050 га |
| 13* | **г. Жабинка,** ул. Береговая, 6 | 122550100001002734 | 0,1500 | 3 432,75 | 600,00 | 1 223,04 | – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Муховец) на всей площади;<br>– на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади;<br>– в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0050 га |

***Целевое назначение использования участков* – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома**

*** – победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона *обязан компенсировать затраты на строительство распределительной и транспортной инфраструктуры в сумме 7529,66 (семь тысяч пятьсот двадцать девять рублей 66 копеек)* до момента ввода в эксплуатацию жилого дома*, сумма указана в ценах на 01.01.2018 и подлежит индексации на день оплаты***

**Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 – **2 550,00 рублей**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.
**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукционных торгов – КУППАПП «Жабинковская архитектура»** | **Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУППАПП «Жабинковская архитектура» на р/с № BY30BLBB30120200216137001001 в ЦБУ № 402 ОАО «Белинвестбанк» г. Жабинка, ул. Свободы, 6а, код банка BLBBBY2X, УНП 200216137, ОКПО 148118831000** |

**Земельный участок предоставляется в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с условиями:**
• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победителем такого аукциона или в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся единственным участником несостоявшегося аукциона:
– внесения платы за земельный участок на расчетный счет соответствующего сельского (районного) исполнительного комитета;
– возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и затрат, связанных с формированием земельного участка, государственной регистрацией в отношении этого участка;
• обращения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в двухмесячный срок после подписания протокола о результатах аукциона или признания аукциона продажи несостоявшимся за государственной регистрацией в отношении земельного участка;
• получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке и сроки технической документации и разрешения на строительство жилого дома;
• занятия (освоения) победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона земельного участка не позднее одного года после государственной регистрации права на него;
• снятия победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона на земельном участке плодородного слоя почвы из под пятен застройки и использования его для благоустройства участка.

**Аукцион состоится 13 ноября 2019 г. в 10.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.00 14.10.2019 г. до 17.00 06.11.2019 г. (время работы с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Жабинка, ул. Свободы, 6а.**
**Контактные телефоны: 8 (01641) 2 13 37, 8 (01641) 2 15 46. Сайты: www.http:zhabinka.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА» (продавец) извещает о проведении повторного 5 ноября 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Номер лота – 1. Капитальное строение** с инвентарным номером 350/С-86422 (наименование: одноэтажное кирпичное здание; назначение: здание специализированное складов, баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), общей площадью 722,3 кв. м с двумя кирпичными пристройками, год постройки – 1981, материал стен – кирпич.
**Дополнительно сообщаем:** ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА» заключен договор аренды № 69/10 от 20.10.2016 г. по 01.10.2021 г. с ЧП «Саленком». Предмет договора – часть капитального строения, которая представляет собой нежилые помещения в одноэтажном кирпичном здании, арендуемая площадь – 106,6 кв. м.
**Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Иногородняя 1-я, 25А.
**Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000003001502, площадью 0,3761 га; участок для эксплуатации и обслуживания проезда общего пользования (доля в праве – 1/3): кадастровый номер 340100000003001501, площадью 0,2260 га.
**Начальная цена продажи с учетом НДС: 71 800,13** бел. руб.
**Задаток (5 %) с учетом НДС: 3 590,00** бел. руб.
Объявление ранее опубликовано в газете «Звязда» от 12.09.2019 г.
**Продавец:** ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА», 220037, г. Минск, ул. Уральская, 4, каб. 502.
Контактный телефон 8-017-330-23-82.
**Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ООО «Деловая оценка»): р/с BY60BELB30121322650030226000** в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, **БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 01.11.2019 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**
**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).
**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.**
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати)** календарных дней с момента подписания протокола; если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати)** календарных дней после подписания договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

О, жанчыны!

## АДКРЫЛІ МЕСЦА, ДЗЕ «ЖАНЧЫН ПАЗБАВЯЦЬ АД СТРЭСУ»

**На іспанскім курортным востраве Маёрка адкрыўся гатэль для жанчын, якія жадаюць пазбавіцца ад «стрэсу паўсядзённага жыцця», паведамляе Daily Mail.**




У новую гасцініцу The Som Dona Hotel, размешчаную ў мястэчку Порта-Крыста, не пускаюць мужчын: яна прызначана толькі для гасцей жаночага полу ва ўзросце ад 14 гадоў. Усяго гатэль мае 39 нумароў, рэстаран, спа-цэнтр, дах з тэрасай і басейн. Ён стаў першым «жаночым» гатэлем у Іспаніі. Кошт адной ночы складае 75 фунтаў стэрлінгаў. Аднак, нягледзячы на тое, што гатэль прызначаны выключна для жанчын, сярод яго работнікаў ёсць мужчыны. Такім чынам кіраўніцтва гатэля выконвае дзеючы ў краіне закон аб дыскрымінацыі па палавой прыкмеце.

## МУЖ ПАКРЫЎДЗІЎСЯ НА ЖОНКУ І ПАХУДЗЕЎ

**Будаўнік з Вялікабрытаніі пахудзеў на 20 кілаграмаў з-за вершаў, якія напісала яго жонка, паведамляе Daily Mirror.**

49-гадовы Эрл Сцюарт часта чапляўся да жонкі Берні з-за яе вагі. Ён не перастаў жартаваць з яе нават пасля адпачынку ў Іспаніі, падчас якога налягаў на ежу больш звычайнага і прыкметна паправіўся. «Аднойчы я ўбачыла, як Эрл раскінуўся на канапе са сваім пузам, і стала друкаваць на сваім iPad новы запіс у дзённіку», — расказала Берні. Яна пісала верш пра нягоды шлюбу, у якім Эрл называўся «бескарысным тоўстым гультаём». Берні скардзілася, што муж ные і бурчыць як маленькае дзіця, гадзінамі займае туалет і не закрывае зубную пасту і шампунь. Так атрымалася, што Эрл знайшоў гаджэт і прачытаў гэты запіс у яе дзённіку. «Ён страшэнна разззлаваўся, — расказала жанчына. — Мы доўга сварыліся, і хоць я спрабавала растлумачыць, што ўсё гэта толькі для смеху, было відаць, што мае словы яго моцна закранулі».



Праз некалькі дзён пасля сваркі Эрл паглядзеў у люстэрка і зразумеў, што сапраўды запусціў сябе. Ён стаў штодня рабіць практыкаванні і на працягу трох месяцаў скінуў 20 кілаграмаў. Берні тым часам села на дыету і таксама пахудзела — на 10 кілаграмаў. «Цяпер мы матывуем адно аднаго весці больш здаровы спосаб жыцця і бясспрэчна сталі куды больш шчаслівыя, чым раней», — адзначыў Эрл.

## КАХАННЕ НА ТРАІХ СКОНЧЫЛАСЯ ЗАМАХАМ НА ЗАБОЙСТВА

**Дзвюх жанчын з горада Франкфурт-на-Одэры ў рэгіёне Брандэнбург (Германія) прызналі вінаватымі ў пяці замахах на забойства іх палюбоўніка, паведамляе выданне Unilad.**

У лістападзе 2018 года 36-гадовы Ральф Леман, 30-гадовая Генрыета Р. і 21-гадовая Мішэль Ф. аддаваліся сумесным любоўным уцехам. Пасля гэтага Мішэль запатрабавала з мужчыны 800 еўра, але той адмовіўся аддаць ёй грошы. Ён заявіў, што іх у яго няма і прапанаваў растэрміноўку.

Як мяркуецца, Мішэль і Генрыета вырашылі адпомсціць мужчыну і паспрабавалі забіць яго. Яны падмяшалі псіхатропныя наркотыкі ў яго напой, затым паехалі ў лес недалёка ад польскай мяжы і апаілі яго наркотыкамі паўтора з намерам забіць мужчыну, пакуль ён будзе непрытомны. Калі гэты план праваліўся, яны ўдарылі яго па галаве дамкратам і пачалі біць піўной бутэлькай.



Калі жанчыны зразумелі, што Леман яшчэ варушыцца, яны паспрабавалі пераехаць яго машынай, у выніку чаго мужчына атрымаў траўмы сцягна і жывата. Пасля гэтага зладзейкі спрабавалі зарэзаць свайго палюбоўніка, але, нягледзячы на ўсе атрыманыя траўмы, мужчына змог збегчы ад іх, скарыстаўшыся палкай.

Калі Леман збег, да сяброўак на дапамогу прыехала іх знаёмая, 19-гадовая Джазэфін С. Дзяўчына паабяцала дапамагчы знайсці ўцекача. Па дарозе на месца злачынства яна шукала ў інтэрнэце, дзе ў чалавечым целе размешчаны розныя ўнутраныя органы. Пазней іх усіх затрымала паліцыя.

У выніку Мішэль і Генрыета былі прысуджаныя да чатырох гадоў турэмнага зняволення кожная за замах на забойства і нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Джазэфін С. прызнана вінаватай у згодзе паўдзельнічаць у здзяйсненні злачынства, яе асудзілі на паўтара года.

**Іван КУПАРВАС.**


БЕЛАРУСБАНК

## Извещение о проведении открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Наименование объектов** | Изолированное помещение, инв. № 142/D-3917, изолированное помещение, инв. № 142/D-3918 |
| **Месторасположение объекта** | Брестская область, г. Малорита, ул. Советская, 111 |
| **Продавец объекта** | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Организатор торгов** | Филиал № 100-БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Брест |
| **Общая площадь помещений** | 195,6 кв. м |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС** | 108 472,55 руб. |
| **Сумма задатка** | 10 847,25 руб. |
| **Информация о земельном участке** | Площадь 0,0584 га |
| **Характеристика объекта** | Здание одноэтажное, кирпичное, 1991 год постройки. Центральное: электроснабжение, отопление, холодное водоснабжение, канализация |
| **Условия оплаты** | По договоренности |

Аукцион состоится 28.11.2019 в 11.00 по адресу: г.Брест, ул. Московская, 202 каб. 907. Документы для участия в аукционе принимаются: г. Брест, ул. Московская, 202, каб.1018 до 23.11.2019.
Два изолированных помещения продаются одним лотом.
К моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с **BY29 AKBB 6670 8597 0423 7100 0000** в филиале № 100-БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Брест, БИК AKBBBY21100, УНН 200246676.
При подаче заявления с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Если на аукцион подана одна заявка, то объект продается этому участнику (с его согласия) по начальной цене, увеличенной на 5 %. Договор купли-продажи заключается в течение 10 дней с даты проведения аукциона.
Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Тел./факс (80162) 277518.

## Информационное сообщение о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для строительства жилого микрорайона по адресу: г. Смолевичи (микрорайон Липки)

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 12.11.2019 г в 15.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 12,8621 га, кадастровый номер 624850100008000760, г. Смолевичи (микрорайон Липки) |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Лот № 1 – для строительства жилого микрорайона (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) |
| 7 | Сроки аренды | Лот № 1 – 99 лет |
| 8 | Начальная цена | Лот № 1 – 1 700 370 рублей |
| 9 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица;<br>В) при проектировании и строительстве учесть регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;<br>Г) получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства, разрешение Смолевичского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | Получатель: Смолевичский районный исполнительный комитет,<br>10 % от начальной стартовой цены на р/с BY98 AKBB36410000006696200000, БИК AKBBBY21612 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиала 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, пр-т Революции, 47 УНП 600014139, ОКПО 04064735 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком | Каждый четверг с 9.00 до 12.00 |

**Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 4 169,48 руб., затраты на публикацию и размещение в сети интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**
**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 119.**
**Окончательный срок приема заявлений – 04.11.2019 г. 17.00.**
Контактный телефон (8-01776) 2-73-42.
Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:
– заявление на участие в аукционе;
– документ подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
– юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
– представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
– представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
– представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
– представителем иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.
**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

## ООО «ТендерКонсалт», организатор торгов по продаже имущества ОАО «Современные розничные технологии», объявляет о проведении 12.11.2019 года с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных публичных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:
**Лот 1.** Автомобиль грузовой специальный ГАЗ-2775 01, 2002 г. в., кузов (VIN) не определен, регистрационный номер АЕ8807-3. Начальная цена – 430,00 без НДС.
**Лот 2.** Строительные материалы, расположенные по адресу: г. Добруш, ул. Полевая. Начальная цена – 162 000,00 без НДС.
Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 29 326 70 40.
Место нахождения предмета торгов: г. Гомель, ул. Дворникова 7, г. Добруш, ул. Полевая.
Сумма шага аукциона – 5 %.
Продавец: ОАО «Современные розничные технологии», +375 29 125 03 65.
Организатор торгов: ООО «ТендерКонсалт», Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Парковая, д. 9, пом. 38/2; +375 29 326 70 40; contact@bankrottorg.by.
Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее 11.11.2019 г. на р/с BY04 UNBS 3012 2095 3000 0000 0933 в ЗАО «БСБ Банк», код банка UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23, корп. 4, УНП 192347368, получатель – ООО «ТендерКонсалт». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № **(номер лота).**
Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 12.10.2019 по 17.00 11.11.2019** на ЭТП bankrottorg.by.
Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.
Стоимость возмещаемых затрат на проведение торгов составляет **288,00** рублей, аукционный сбор в размере 3 % от конечной цены предмета торгов.
Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.
Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.
Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.
В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Подписание договора купли-продажи – в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.
Оплата по договору купли-продажи – в течение 15 рабочих дней с даты проведения торгов.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе

| |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-28377 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 234,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Чехова, 23 (доля в праве 49/117) |
| Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000005000522, площадью 0,0290 га (назначение – обслуживание магазина), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Чехова, 23 (доля в праве 49/117) |
| Начальная цена продажи – 42 660 руб. (сорок две тысячи шестьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 4266 руб. (четыре тысячи двести шестьдесят шесть рублей) |
| ОАО «Торгово-производственная фирма «Лида», 231300, г. Лида, ул. Кирова, 6. Тел. 8-0154-617-577, факс 8-0154-522-540 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70 |
| Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1,5 % от конечной цены продажи объекта. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 25 октября 2019 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**<br>Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.07.2019 г. |
| **Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**<br>**Последний день приема заявлений – 23 октября 2019 г. до 15.00** |
| *Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/* |

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, **BELTORGI.BY.**
Продавец: КПДУП «Слуцкое управление производственно-технологической комплектации» (УНП 690605915) в лице управляющего ООО «Центр антикризисных проектов П-К», +375 (17) 395-89-17.
Первые повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **28 октября 2019 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.
Предмет торгов – **Котельная в блочно-модульном исполнении производственная 6,5 т п/ч (инв. № 1655) и газопровод высокого давления (инв. № 1656).** Начальная цена предмета торгов – 124 110,00 бел. руб., без НДС. Местонахождение – г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, д. 5. Контактный телефон для ознакомления и осмотра 8 (029) 691-36-99, Александр Владимирович.
**Для участия в торгах необходимо в срок по 25.10.2019 г. 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
**Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.**
Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем электронных торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи предмета торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Минская правда» от 22.05.2019 г.

# СВЯТЫНІ ЗЯМЛІ ЗАПАВЕТНАЙ

## Замалёўкі з паломніцкай паездкі ў Іерусалім



Храм Уваскрэсення Хрыста.

**Ну вось і здзейснілася мая мара. Я сяджу ў мікрааўтобусе і не магу паверыць, што хутка на свае вочы ўбачу біблейскія мясціны і нават зайду ў святая святых — Кувуклію — самае патаемнае месца Храма Уваскрэсення Хрыстова, куды на Вялікдзень сыходзіць жыватворны агонь. У мяне ёсць пра што папрасіць Бога, калі я апушчуся на калені перад свяшчэнным яго каменным ложам — тым самым, на якім біблейскія жанчыны-міраносіцы не засталі знятага з Крыжа Збавіцеля. Памятаеце? Іх сустрэў анёл. «Што вы шукаеце жывога сярод мёртвых? — сказаў ён ім. — Яго няма тут: Ён уваскрос!»**

### МАГІЛЁЎ — КІЕЎ — ТЭЛЬ-АВІЎ

Наш мікрааўтобус стаіць у двары магілёўскага храма Трох Свяціцеляў. Нас усяго 19 чалавек. Ахвотных было б болей, але паездка не з танных. Сем дзён — 800 долараў, але гэта з пералётам, трансферам (у тым ліку па Ізраілі), гасцініцай і нават харчаваннем. Аб'ява пра паездку з'явілася ў царкоўнай краме яшчэ вясной. Пры жаданні грошы можна было сабраць. Але мала хто рашыўся аддаць іх за сем дзён у Іерусаліме. Пакуль мы сядзім у мікрааўтобусе, айцец Мікалай, які суправаджае нас да Кіева, ціха чытае малітву. Потым невялікая пераклічка — ці ўсе на месцы? Нарэшце машына кранаецца.

Пасажыры маршруткі — у асноўным жанчыны. Адной з паломніц 80 гадоў, але яна нават не вагалася, ехаць або не. Для 58-гадовай Алены паездку часткова спансіраваў сын. «Ён, — усміхаецца жанчына, — з дзяцінства марыў адправіць мяне ў Божы Горад». Жанчына веруючая, і сын ведаў, што для яе гэта паездка — самы жаданы падарунак. Яшчэ, каб здзейсніць падарожжа, яна прадала карову. «Я ад яе ў любым выпадку пазбавілася б, яна ўжо старая была», — нібыта апраўдваецца жанчына.

У кожнага свая прычына наведаць Святую зямлю. Побач са мной сядзіць Надзея. Яна расказвае, што зрабіла ў маладосці аборт і вельмі перажывае праз гэта. Нават пасля таго, як гэты грэх спавядала. Наогул у кожнага нешта сваё патаемнае, свой шкілет у шафе. Камусьці хапае смеласці казаць пра гэта ўслых, нехта лічыць за лепшае маўчаць. І гэта яго права.

Раптоўна гаворка заходзіць пра Мёртвае мора. Гэта адно з тых біблейскіх месцаў, якія мы маем наведаць. Салёнае возера, як яго яшчэ называюць, сёння лічыцца адной з папулярных у свеце водалячэбніц. І, напэўна, любая жанчына ведае ізраільскую касметыку, створаную на аснове вады Мёртвага мора. Але ў праваслаўных да гэтага прыроднага ўтварэння асцярожнае стаўленне. Памятаеце гісторыю пра гарады Садом і Гамора, сцёртыя Богам з зямлі? У інтэрнэце можна знайсці інфармацыю, што менавіта на дне Мёртвага мора англійскія археолагі выявілі старажытныя руіны тых гарадоў. Некалькі маіх спадарожніц адразу ж заявілі, што ні за якія багацці не стануць акунацца ў заганныя воды. «Але ж трэба камусьці праверыць законы фізікі», — па-філасофску адзначае адна з маіх спадарожніц, якая выкладае ў школе гэты прадмет. Дарэчы, у адрозненне ад мяне, яна так і не рызыкнула акунуцца ў воды Мёртвага мора. Толькі ногі крыху памачыла.

У Кіеве мы павінны далучыцца да ўкраінскіх паломнікаў. Група адразу ж павялічваецца болей чым да 50 чалавек. Уласна,



Камень памазання, куды паклалі знятага з Крыжа Хрыста.



Вія Даларoса праходзіць праз гандлёвыя рады старога Іерусаліма.

менавіта ўкраінскі праваслаўны паломніцкі цэнтр «Вытокі» і арганізаваў паездку. Мы знаёмімся са свяшчэннікам — айцом Аляксандрам, які гэтыя сем дзён становіцца нашым духаўніком. Яму крыху за сорак, але ён ужо архімандрыт. У царкоўнай іерархіі гэта высокая прыступка. Нам раздалі папкі, у якіх знаходзяцца білеты на самалёт, і карысныя ўлёткі, дзе пазначаны нумары тэлефонаў, па якіх звязвацца ў выпадку непрадбачаных сітуацый, расклад паломніцкіх паездак украінскага праваслаўнага цэнтра, ваўчар на пражыванне ў віфлеемскай гасцініцы.

Вылет у тры гадзіны ночы. Чырвонага колеру самалёт авіякампаніі «Ружа вятроў» ужо чакае нас на пасадачнай паласе. Усе яго пасажыры — а гэта 218 чалавек — паломнікі.

### НАЯЎНАСЦЬ ВІЗЫ НЕ ГАРАНТУЕ ЎЕЗДУ

Ноч. Але сон мацнейшы за хваляванні. Раптам расплюшчваю вочы і прыходжу ў захапленне ад карцінкі ў ілюмінатары. На небе яшчэ не згас месяц, але ён формай нагадвае не звыклы кожнаму беларусу серп, а калыску, падобную да той, што вянчае мусульманскія мінарэты. Сонейка ўжо пафарбавала палоску неба ўздоўж зямлі ў ярка-чырвоны колер. Пад намі лёгкія аблокі, і здаецца, што яшчэ хвіліна — і з-за вунь той пухнатай пярыны пакажацца твар легкакрылага херувіма, падобнага на тых, якія намаляваны на палотнах мастакоў эпохі Рэнесансу. Самалёт рэйсам Кіеў — Тэль-Авіў прызямляецца ў аэрапорце Бэн-Гурыён а шостай гадзіне раніцы. Але ўздыхаць з палёгкай яшчэ рана. Бо яшчэ не факт, што цябе пусцяць на тэрыторыю краіны, да якой ты ўжо далящеў. Безвізавы рэжым — зусім не гарантыя: усё залежыць ад рашэння ізраільскай службы бяспекі. А яна вельмі насцярожана ставіцца да сваіх гасцей. Яшчэ ў Магілёве нас папярэдзілі, што з ізраільскімі пагранічнікамі лепш не жартаваць, гутарыць трэба спакойна, ні ў якім разе не спрачацца. Пытанні ж могуць быць самыя нечаканыя. Не выключана, што праверяць нават мабільны тэлефон, каб высветліць, ці ёсць знаёмыя ў Ізраілі. Эх, рэкамендаваў жа бацюшка ўзяць з работы пацвярджэнне, што я працую і нагоды застацца ў чужой краіне ў мяне няма. Але, як заўсёды, добрая думка прыходзіць апасля. З сумам гляджу на вялікую чаргу перада мной, якая цягнецца вунь да таго далёкага акенца, і стараюся не думаць пра кепскае. Але калі бачыш, як чарговы чалавек не атрымаў пашпарт на рукі, а адправіўся кудысьці для далейшых перамоў, становіцца крыху не па сабе. Калі падыходзіць мая чарга, адзінае, што мне хочацца, — каб усё гэта скончылася як мага хутчэй. Малады чалавек за шклом звярае мяне з фота ў пашпарце і пачынае допыт. «Мэта вашага візіту?», «З кім прыехалі?», «Ці ёсць у Ізраілі знаёмыя?», «А сям'я?», «Месца работы?», «У якасці каго?», «Пра што пішаце?» Хлопец яшчэ раз скануе мяне пранізлівым позіркам і... працягвае пашпарт з паперкай, якая дае мне права знаходзіцца на тэрыторыі Ізраіля. Ледзь стрымалася, каб не закрычаць: «Ура!» Усё яшчэ на ватных ад хвалявання нагах іду атрымліваць багаж. Стрэлкі гадзінніка паказваюць амаль 10 гадзін раніцы. Але група — а гэта, нагадаю, 50 чалавек — атрымліваецца сабрацца толькі ў абед (апошняя паломніца далучаецца да нас ужо ў гасцініцы пад вечар). На жаль, з 19 беларусаў застаецца толькі 17. Двум мужчынам з Брэста, якія далучыліся да нас у Магілёве, адмовілі ва ўездзе, а іх 750 долараў на кожнага (сума ўносілася загадзя) сышлі ў невядомым кірунку. Шкада суайчыннікаў. А яшчэ нашага беларускага арганізатара, якому Уладыка забараніў займацца гэтай дзейнасцю. Нехта ўслых выказаў здагадку, што мужчыны, напэўна, хацелі застацца тут працаваць. Але гэта толькі меркаванне. Проста такіх выпадкаў, кажуць бывалыя, вельмі шмат. І ўсё ж такі ізраільскія пагранічнікі крыху далі маху. У апошні дзень, калі мы ўжо сядзелі ў поўным сэнсе слова на чамаданах, адна дзяўчына з украінскай групы папярэдзіла суседку па нумары, што ёй з намі болей не па дарозе, і сышла ў невядомым кірунку. У аэрапорт яна так і не прыехала.

### З ВІДАМ НА ВІФЛЕЕМ

29 верасня жыхары Ізраіля адзначылі Новы год — 5780-ы ад стварэння свету. Свята называецца Рош ха-Шана і святкуецца некалькі дзён. На гэтыя дні ў краіну прыязджае шмат народу — у тым ліку паломнікаў. Нашы арганізатары спецыяльна падгадалі час, каб у нас была магчымасць сэканоміць на білетах і пражыванні. У такія дні цэны адчувальна ніжэйшыя.




Прэторыя, дзе рымскі пракуратар Понцій Пілат здзейсніў суд над Ісусам.

Іерусалімскі гід Аляксандра цярпліва чакала нас у аэрапорце ўсе тыя доўгія гадзіны, пакуль мы праходзілі пагранічны кантроль. Сама яна з Адэсы, але ў краіне жыве больш за 20 гадоў. Паломніцкія паездкі — гэта яе бізнес. І мы гэта хутка адчулі. Літаральна на наступны дзень яна прывяла нас у краму да свайго знаёмага, дзе нам дазволілі купіць сувеніры за паўцаны. Але ўжо на наступны дзень стала зразумела, што ўсё гэта можна было набыць яшчэ як мінімум напалову танней у іншых месцах.

Мы жывём у Бейт-Сахуры (даліне пастухоў) у гатэлі, які ўтрымлівае арабская сям'я. Яна ж гатуе для нас шведскі стол. У меню пастаянна мясныя, рыбныя стравы, агародніна, рыс, макарона, сыры, алівы, якія тут растуць на кожным кроку. Яны вельмі смачныя, але іх яшчэ трэба ўмець прыгатаваць. Пакаштавала адну з дрэва і адразу ж пашкадавала: ну і атрута! Самы запатрабаваны прадукт у краіне — вада: піць хочацца пастаянна. На вуліцы сапраўдная парылка — за 30 з плюсам. Вакол фінікавыя пальмы, цытрусавыя дрэвы, экзатычныя кветкі і кактусы. Але ўсё гэта ў асноўным у населеных пунктах, дзе жывуць людзі. Большай часткай Запаветная Зямля — гэта высушаная сонцам зямля з рэдкімі дрэвамі. Але, як удакладніла наша гід, праблема з расліннасцю ў Ізраілі — да першых дажджоў. Дзесьці з кастрычніка яны некаторы час ідуць бесперапынна. Краіна ператвараецца ў квітнеючы аазіс.

У Віфлееме шмат веруючых. З акна гасцініцы можна ўбачыць купалы праваслаўнага храма і вежу мусульманскай мячэці. Засынаеш пад гукі гарачай малітвы і прасыпаешся пад яе. Спачатку пачынае спяваць мула, потым яго цягучы пранізлівы крык перакрываюць мілагучныя галасы праваслаўных званоў. Раніца спявае на ўсе лады — храмы, пеўні, пеўчыя птушкі, аўтамабільныя клаксоны. Жыццё кіпіць, пакуль не пачалася спякота, потым крыху запавольваецца і зноў прачынаецца пад вечар. У нас вялікая паломніцкая праграма. Таму хутчэй снедаць — і наперад па стара- і новазапаветных мясцінах. Тыя, хто прыхапіў Біблію, могуць звяраць яе на месцы — рэчавыя доказы таго, што там напісана, на кожным кроку. У мяне з сабой Бібліі няма, але ўвесь цуд у тым, што з глыбінь свядомасці пачынаюць усплываць сакральныя тэксты. І ты адчуваеш, як усё вастрэй пранікаешся тымі падзеямі.

### ВІЯ ДАЛАРОСА

Жоўта-белы камень старадаўніх будынкаў, шэрая маставая, нагрэтая іерусалімскім сонцам так, што здаецца: плёсні на яе вадой — зашыпіць. Сёння пятніца, той самы дзень тыдня, калі пакаралі Хрыста. Мы спяшаемся ў стары Іерусалім, каб на месцы перажыць тыя апошнія хвіліны яго жыцця. Вія Даларoса (Тужлівы шлях) — тая самая дарога, па якой вялі на Галгофу Хрыста. Ад Прэторыі (крэпасці Антонія), дзе вынеслі прысуд пакаранаму, і да Галгофы (сёння тут Храм Уваскрэсення Хрыстова) мы ідзём па вузкіх гандлёвых радах арабскага квартала. Трэба сканцэнтравацца, а з бакоў табе прапануюць то крыжыкі, то магніты з відамі святых месцаў, то гранатавы сок, які робіцца на тваіх вачах. Спакус шмат: так хочацца пакруціць у руках вунь тую ляльку, а вось гэты заплечнік так пасуе да майго абутку. Пра што гэта я? Вось тут шмат стагоддзяў таму ішоў знясілены, абражаны, асуджаны на нечалавечыя пакуты Хрыстос, а ў галаве аднекуль бяруцца спажывецкія думкі. Можна, аказваецца, здраджваць неўсвядомлена. Дават водзіца ўзносіць над сабой плётку (дастаткова ў думках) і болей не глядзець па баках. Крыху не па сабе ад узброеных людзей з аўтаматамі праз плячо. Гэта, тлумачыць гід, прадстаўнікі Іерусалімскага ісламскага савета, якія патрулююць тэрыторыю. Наогул стары горад Іерусаліма сёння стаў месцам супрацьстаяння трох рэлігій: ісламу, хрысціянства і іўдаізму. Нават Храм Уваскрэсення Хрыстова падзелены паміж праваслаўнымі, каталікамі і армянамі. Штодзень тут здзяйсняюцца тры літургіі. Гэты храм — найсвяцейшае месца для паломнікаў з усяго свету. Тут адначасова гучаць дзясяткі моў. Ён пабудаваны на месцы ўкрыжавання Хрыста, яго пахавання і ўваскрэсення. У часы тых падзей Галгофа знаходзілася за гарадскімі сценамі. Цяпер яна ўнутры храма. Першыя хрысціяне так шанавалі гэтае месца, што рымскі імператар Адрыян пабудаваў тут паганскі храм Венеры, каб пазбавіць іх гэтай святыні. Але такім чынам толькі абазначыў святое месца. У IV стагоддзі імператар Канстанцін узвёў тут прыгожы храм у гонар Хрыста. Ён перажыў некалькі разбурэнняў, але ўсё ж такі быў аднаўлены і стаіць да нашых часоў.

Месца амаль міфічнае, тут адчуваеш сябе пылінкай у бяздонным сусвеце. І толькі пакаянне прыносіць палёгку...

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*Іерусалім.*

*(Працяг будзе.)*

# ВЯРТАННЕ КАНЦЛЕРА



## Чаму Аўстрыя зноў даверылася Себасцьяну Курцу?

**У Аўстрыі поўным ходам ідуць перагаворы па фарміраванні новага ўрада. Прэзідэнт краіны Александэр ван дэр Бэлен надзяліў лідара кансерватыўнай Аўстрыйскай народнай партыі (АНП) Себасцьяна Курца адпаведным мандатам па выніках датэрміновых выбараў у Нацыянальны савет (ніжняя палата парламента). Цырымонія адбылася ў пачатку гэтага тыдня ў адміністрацыі кіраўніка дзяржавы ў палацы Хофбург у Вене. Лідар АНП — колішні і будучы канцлер — атрымаў права правесці перагаворы па пытанні стварэння новага кабінета міністраў, таму што яго партыя перамагла на выбарах і атрымала вялікую частку дэпутацкіх мандатаў. Чаму Аўстрыя зноў даверылася Курцу, якія цяпер магчымыя камбінацыі?**

## КАНЕЦ «ВЯЛІКАЙ КААЛІЦЫІ»

Аўстрыя — адна з найбольш паспяховых краін Еўрапейскага саюза з высокім узроўнем і якасцю жыцця. Пра стабільнасць сацыяльна-эканамічнай сістэмы яскрава сведчыць той факт, што агульны валавы ўнутраны прадукт у разліку на душу насельніцтва ў рэспубліцы складае 42 тысячы еўра. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын у Аўстрыі складае 78 гадоў, жанчын — 84.

Рэальная сярэдняя зарплата дасягае 2000 еўра. Аўстрыйская эканоміка дэманструе ў апошнія гады добрыя тэмпы росту — у 2018-м ён склаў 2,8 працэнта. Па ўзроўні беспрацоўя гэта дзяржава, як і іншыя альпійскія краіны, таксама



сярод найлепшых: цяпер толькі пяць працэнтаў працаздольных жыхароў не маюць у Аўстрыі пастаяннай работы. Зусім не крытычны і ўзровень нацыянальнага доўгу — 78 працэнтаў ВУП.

Апошнія гады працягвала таксама стабільна расці пакупніцкая здольнасць насельніцтва. Аўстрыя — гэта перш за ўсё «эканоміка паслуг», прычым моцна арыентаваная на экспарт, адзначылі spbvedomosti.ru. Але нездарма тры працэнты ВУП выдаткоўваюцца там на даследаванні і інавацыі: краіна валодае вельмі высокім і канкурэнтаздольным узроўнем рабочай сілы і адукацыі, а таксама выдатнай сістэмай аховы здароўя і ў цэлым сацыяльнага забеспячэння.

Сучасная сацыяльная мадэль альпійскай рэспублікі стала магчымай дзякуючы кампрамісу паміж дзвюма галоўнымі партыямі пасляваеннай Аўстрыі — сацыял-дэмакратамі (СДПА) і правацэнтрысцкай Аўстрыйскай народнай партыяй (АНП). Пасля аднаўлення дзяржаўнасці яны па чарзе змянялі адна адну ва ўладзе, а нярэдка і кіравалі разам у рамках «вялікай кааліцыі» — пры адсутнасці сур'ёзных сацыяльна-палітычных канфліктаў. Але ў 2017 годзе, пасля таго як на парламенцкіх выбарах перамогу атрымала дагэтуль другая па ўплыве АНП, гэтаму прыйшоў канец. На тыя выбары правацэнтрыстаў вёў 31-гадовы міністр замежных спраў Себасцьян Курц. Ён стаў да таго часу і старшынёй народнай партыі, шмат у чым стварыўшы сабе імідж прыхільніка кансерватыўнага павароту. Ён пераканаў кіраўніцтва правацэнтрыстаў адмовіцца ад урадавай кааліцыі з СДПА на карысць стварэння «буржуазнага» ўрада з трэцяй па ўплыве сілай краіны — Аўстрыйскай партыяй свабоды (АПС), якая займае правапапулісцкія і нацыяналістычныя пазіцыі. У выніку Курц стаў самым маладым у гісторыі краіны канцлерам — кіраўніком урада.

## ПАСЛЯ «ІБІЦА-ГЕЙТУ»

Гэты кабінет праводзіў кансерватыўную палітыку, зрабіўшы стаўку на «інвентарызацыю» сацыяльных дапамог, лібералізацыю сацыяльнага заканадаўства, прыняўшы рашэнне, якое дазваляе прадпрымальнікам павялічваць рабочы дзень (пры ўзгадненні з работнікамі) да 12 гадзін. У той жа час былі скарочаны падаткі з заробку працуючых бацькоў, павялічаны дапамогі на дзяцей, уведзены базавы мінімальны даход, паведамілі spbvedomosti.ru. Асабістая палітычная папулярнасць Себасцьяна Курца пры гэтым была досыць вялікая, пра што сведчыць відавочная перамога яго партыі на майскіх еўравыбарах — тады АНП атрымала каля 35 працэнтаў галасоў.

Але трэба адзначыць, што такі вынік быў дасягнуты на фоне магутнага палітычнага скандалу, які развaліў правы ўрад. Гэты скандал з'явіўся вынікам відавочнай правакацыі: адбыўся ўкід у СМІ знятага яшчэ ў 2017 годзе відэа пра сустрэчу на Ібіцы двух лідараў АПС з маладой жанчынай. Яна паабяцала не зусім цвярозым на той момант партыйным дзеячам фінансавую падтрымку свайго «дзядзькі» ў куплі акцый венскага таблоіда. Потым шмат спрачаліся, кім насамрэч была «пляменніца алігарха». Але ў выніку Курц, заявіўшы пра тое, што «больш не давярае «свабоднікам», выставіў іх з кабінета міністраў. Тыя ж, у сваю чаргу, ініцыявалі вотум недаверу самому канцлеру.



Гэты скандал прычыніў сур'ёзную шкоду рэйтынгам АПС і адначасова сыграў на руку АНП, адзначала нямецкая газета Frankfurter Allgemeine Zeitung (FAZ): па звестках апытанняў, значная частка выбаршчыкаў, якія ў 2017-м выбралі АПС, цяпер прагаласавалі за народную партыю. Аўстрыйцы, відавочна, спадзяюцца, што АНП вернецца ў традыцыйную для сябе нішу палітычнага цэнтра, і Курцу варта прыслухацца да гэтага закліку, мяркуе Frankfurter Suddeutsche Zeitung. Ад скандалу пацярпелі і сацыял-дэмакраты: яны былі не гатовыя да датэрміновых выбараў, асабліва да спаборніцтва з «зялёнымі», тады як Курц вёў актыўную кампанію, пастаянна з'яўляючыся на тэлебачанні і падтрымліваючы кантакты з выбаршчыкамі ў сацыяльных медыя, што яшчэ больш спрыяла росту яго папулярнасці.

## ОПЦЫІ І ВАРЫЯНТЫ

Выбары ў Нацыянальны савет у канцы верасня прынеслі новую відавочную перамогу АНП. Калі два гады таму «народнікі» сталі самай уплывовай партыяй краіны, набраўшы 31,5 працэнта галасоў, то цяпер АНП атрымала 38,4 працэнта і 73 мандаты ў 183-меснай ніжняй палаце парламента. Такім чынам, партыю падтрымалі не толькі яе традыцыйныя выбаршчыкі з ліку буржуазіі, сярэдняга класа і сялянства, але і значная частка наёмных рабочых і служачых. Увогуле, народная партыя на чале з Себасцьянам Курцам сёння цалкам апраўдвае сваю назву.

«Гэтыя выбары былі абсалютна прадказальныя. І яны паказалі, што Курц як аўтарытэтны палітык нават не аўстрыйскага, а еўрапейскага маштабу мае ўсе шанцы стаць новым канцлерам», — адзначыў vz.ru загадчык аддзела сацыяльных і палітычных даследаванняў Інстытута Еўропы РАН Уладзімір Швейцар. Разам з тым, заўважыў эксперт, у Курца і яго партыі даволі сур'ёзныя цяжкасці, бо для таго, каб быць на чале ўрада, неабходна мець абсалютную большасць у парламенце або ствараць кааліцыю. Так, сам малады лідар АНП у ходзе перадвыбарнай кампаніі казаў: «Мы не спекулюем на міністэрствах і кааліцыях». Відавочна таксама, што вярхушка «народнікаў» наогул гатовая пайсці на стварэнне кабінета парламенцкай меншасці. Аднак ці атрымаецца такая камбінацыя? Увогуле, калі не лічыць гэтай опцыі, у АНП цяпер вымалёўваюцца адразу тры варыянты.

Па-першае, аднаўленне даўно вядомай для Аўстрыі формулы «вялікай кааліцыі» з СДПА. Але калі да 2017 года сацыял-дэмакраты ў гэтай пары выступалі ў якасці лакаматыва, то цяпер ролі памяняліся. Насуперак уласным чаканням, вядучая левая партыя Аўстрыі не выйграла ад скандалу на Ібіцы. Больш за тое, калі ў 2017-м СДПА даверыліся 27 працэнтаў выбаршчыкаў, то цяпер яны атрымалі толькі 21,5 працэнта галасоў і набылі толькі 41 дэпутацкі мандат — на 11 менш, чым два гады таму. Між тым у 1970-я гады за сацыял-дэмакратаў аддавала галасы ледзь не паўкраіны. Увогуле, гэта найгоршы вынік за ўсю пасляваенную гісторыю партыі, што лішні раз пацвярджае сістэмны характар крызісу такіх партый у Еўропе. І тут паўстае заканамернае пытанне: ці захоча «патрапаная» СДПА станавіцца малодшым партнёрам у такой невыгаднай сітуацыі?

«Ібіца-гейт» аказаўся наймацнейшым выпрабаваннем для АПС. Дыскрэдытацыя Хайнца-Крысціяна Штрахе хоць і прывяла да яго адстаўкі, але былы міністр транспарту Норберт Хофер, які стаў на чале партыі, не здолеў стрымаць працэс падзення «свабоднікаў». Нягледзячы на тое, што для аўстрыйскай грамадскай думкі ўзнятыя АНП пытанні (грамадская бяспека, масавая іміграцыя, выклікі ісламізацыі) уяўляюцца немалаважнымі, атрымалася так, што ў вачах грамадскасці носьбіты гэтых ідэй раптам пазбавіліся маральнай апоры. АНП праводзіла сваю кампанію шмат у чым на супрацьстаянні з АПС і здолела прыцягнуць на свой бок частку былых вельмі правых выбаршчыкаў, тады як «свабоднікі», набраўшы 17,3 працэнта галасоў, страцілі дзевяць пунктаў і амаль два дзясяткі дэпутацкіх мандатаў. Так, Норберт Хофер падчас кампаніі заклікаў «працягнуць супрацоўніцтва» з АНП, і арыфметычна ў нацыянальным савеце зноў мае месца правая большасць. Як адзначаюць эксперты, такі варыянт таксама магчымы, але пры новай канфігурацыі суадносіны сіл яшчэ больш будуць на карысць «народнікаў».

Трэцяя схема здаецца нібыта малаімавернай, але феерычнае вяртанне партыі «зялёных» у парламент з 12,4 працэнта галасоў і 23 дэпутатамі робіць тэарэтычна магчымым стварэнне нябачанай для Аўстрыі ўрадавай кааліцыі АНП і экалагістаў. Хоць падобная опцыя прымусіць «зялёных», якія маюць адрозныя ад кансерватараў пазіцыі па іміграцыі і сацыяльнай палітыцы, пайсці на сур'ёзныя саступкі.

Не выключаецца і траістая кааліцыя «Народнай партыі», «Зялёнай альтэрнатывы» і лібералаў NEOS: з-за цалкам незвычайнай камбінацыі колераў — бірузовага, зялёнага і ружовага — яе называюць «кааліцыяй дырндля» (альпійскі нацыянальны ўбор). У любым выпадку на кааліцыйныя перагаворы спатрэбіцца нямала часу: пытанне пра тое, з кім уступіць у кааліцыю Себасцьян Курц, застаецца галоўнай інтрыгай мінулых выбараў. І вырашацца яно будзе, як мяркуюць эксперты, аж да Каляд.

## ГАЛОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ

Што ж датычыцца знешнепалітычнай сферы, то, думаецца, незалежна ад расфарбоўкі новага ўрада курс Аўстрыі наўрад ці прыкметна зменіцца. Як вядома, паводле канстытуцыйнага закона 1955 года, гэта альпійская рэспубліка з'яўляецца нейтральнай дзяржавай, і большая частка насельніцтва сёння падтрымлівае захаванне такога статусу. У той жа час Аўстрыя прытрымліваецца практыкі актыўнага нейтралітэту. Краіна гатовая выступаць у якасці пасярэдніка пры вырашэнні міжнародных спрэчак. Аўстрыйскія вайскоўцы бяруць удзел у міратворчых аперацыях ААН у Афганістане, Косаве, Босніі і Ліване.

Себасцьян Курц і ранейшы аўстрыйскі ўрад былі настроеныя на шырокую геаграфію супрацоўніцтва. Сам кіраўнік кабінета з гэтай нагоды казаў: «Аўстрыя, як маленькая, але моцная экспартная краіна, зацікаўлена ў добрых адносінах з Захадам і Усходам». Себасцьян Курц мае намер зрабіць галоўнай задачай свайго новага ўрада барацьбу з нелегальнай іміграцыяй. Іншай важнай тэмай новага ўрада будзе барацьба з пагрозай эканамічнага спаду і ростам беспрацоўя, расказаў далей Курц. Паводле яго слоў, таксама неабходна знізіць падаткі для працоўных і пенсіянераў. У якасці чацвёртага пункта 33-гадовы палітык назваў меры супраць змены клімату.



**Захар БУРАК.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

| |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 440/С-12972 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 1) общей площадью 91,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135; капитальное строение, инв. № 440/С-12973 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 2) общей площадью 44,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/1; капитальное строение, инв. № 440/С-12974 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 3) общей площадью 32,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/2 |
| Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424950100001002618, площадью 0,2097 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), находящемся по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская |
| Начальная цена продажи – 90 000 руб. (девяносто тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 4500 руб. (четыре тысячи пятьсот рублей) |
| Продавец – Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, тел. 8-01593-76-705 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 24 октября 2019 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**<br>Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.05.2019 г. |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**<br>**Последний день приема заявлений – 22 октября 2019 г. до 15.00** |
| *Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/* |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», г. Молодечно, ул. Замковая, 19 | | |
| **Предмет аукциона Местоположение: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Замковая, 19** | | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
| **Лот № 1** | | | |
| **Здание блока вспомогательных цехов** | 2676,8 кв. м | 630/С-79012 | 19/М |
| Составные части и принадлежности: навес на металлических столбах | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 34 508,76 бел. руб.** (снижена на 90 %) | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Административно-хозяйственное помещение** | 1313,8 кв. м | 630/D-45418 | 19А/3-1 |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 95 986,08 бел. руб.** (снижена на 80 %) | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | | | |
| Срок подписания договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.09.2019 | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Аукцион состоится 25.10.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 23.10.2019 до 17.00** по указанному адресу | | | |
| Тел.: +375 17 280-36-37; +375 44-317-95-42. www.cpo.by.<br>E-mail: auction@cpo.by | | | |

## Извещение о проведении 24 октября 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов** |
|---|
| «Автомобильная стоянка» с инв. № в ЕГРНИ 610/С-50418 (**назначение:** сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства; **составные части и принадлежности:** площадка автомобильной стоянки (А), асфальтобетонное покрытие (а1), щебеночно-гравийное покрытие (а2), дорожки (а3), ограждение (Б), ограждение железобетонное (б1), ворота, калитка, ограждение металлическое на ж/б столбах (б2), ворота, калитка, ограждение металлическое (б3), блок-комната (Г2/бл) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,3802 га, кадастровый номер – 640400000007000074 |
| Местонахождение – Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пер. Инкубаторный, 10Г |
| Начальная цена – 40 170,86 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 4000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.
**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
